ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ

Леапольд Стаф

ВЫСОКІЯ ДРЭВЫ





ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ

Леапольд Стаф

ВЫСОКІЯ ДРЭВЫ

ВЕРШЫ

Пераклад з польскай

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1994

ББК 84(4П)
С78
УДК 884-1

СЕРЫЯ ЗАСНАВАНА Ў 1971 г.

Рэдкалегія:

Рыгор Барадулін, Васіль Зуёнак,
Васіль Сёмуха, Янка Сіпакоў, Максім Танк

Перакладзена з выданняў:

Staff L. Wiersze zebrane. T. 1—5.
Warszawa: PIW, 1955.

Пераклад з польскай
Алега Мінкіна

Прадмова
Уладзіміра Калесніка

С $\frac{8840000000-071}{\text{М } 302(03)-94}$ 126—94

ISBN 5-340-01371-5 (беларус.)

© Пераклад. А. Г. Мінкін, 1994

© Прадмова. У. А. Калеснік, 1994

ЗЯМНОЕ І ЗАНЯБЕСНАЕ

Творчасць Леапольда Стафа пачыналася ў трывожным чаканні рэвалюцыі 1905 года ў Расіі. Да гэтай дзяржавы належала большая частка польскіх земляў, таму, хоць сам паэт нарадзіўся і вучыўся ў Львове, на тэрыторыі Галіцыі, што ўваходзіла ў Аўстра-Венгрыю, аднак успрымаў з сябрамі-студэнтамі рэвалюцыю на Усходзе як гістарычны шанц адраджэння падзеленай і паняволенай суседнімі імперыямі Польшчы. Літаратурная моладзь Кракаўскай ды Познанскай зямель гуртавалася тады ў патрыятычным руху Młodej Polski, які меў сваё нацыянальнае ўспрыманне ідэй рэвалюцыйнай дэмакратыі і сацыялізму. Не беручы глыбока да сэрца запаведзяў сацыяльнай роўнасці, справядлівасці, удзельнікі гэтага руху ап'яняліся ніцшэанскім поклічам да неўтаймаванага бунту супраць мяшчанства, культу пакорлівай і прытворнай маралі. Іх ідэалам быў моцны чалавек, гатовы пераступіць цераз мяжу дабра і зла дзеля поўнай свабоды асобы і радзімы. Паражэнне рэвалюцыі адгукнулася крызісам бунтарства ў асяроддзі патрыятычнай моладзі, бунт уступаў месца пагадненню з рэчаіснасцю або ўпадніцтву, дэкадэнцкім настроям фаталізму.

Асабістая і грамадзянская біяграфія Стафа не была жыццём без здарэнняў, як гэта ён гаварыў у адным з вершаў. Пасля сканчэння універсітэта юнак едзе ў Кракаў, знаёміцца са здабыткамі тагачаснай польскай паэзіі і мастацтва, друкуе першы верш у часопісе «Маладосць». Потым прыходзіць першы зборнік «Сны аб магутнасці», паездка на два гады ў Парыж, дзе ён ужываўся ў творчае асяроддзе духоўнай сталіцы Еўропы, асэнсоўваў пошукі і плён парыжскай творчай эліты, ужываўся ў паэзію Верлена, Бадлера, часта ездзіў у Італію грэць душу ля шэдэўраў антычнасці, вучыўся даражыць духам продкаў і адраджаць забытае. Л. Стаф увайшоў у паэзію як той, хто ўмеў бачыць падабенства эстэтычных асноў класікі і мадэрну.

З 1912 года стала жыў у маёнтку Брухавіцы пад Львовам, дзе мог не толькі любавацца вясковай ідыліяй, але

бачыў брыдоту нэндзы і галечы. Сярод утульнасці і дастатку самога яго хапіў трагічны кон: памёр раптоўна любімы брат, здольны паэт, які не паспеў здзейсніцца, застаўся толькі статыстам на паэтычнай сцэне маладой паэзіі.

У часы першай сусветнай вайны Брухавіцы апынуліся ў зоне баявых дзеянняў, згарэлі, з дымам пайшлі паэтава бібліятэка і многа рукапісаў. Сам ён быў захоплены рускімі войскамі і ў ролі цывільнага палоннага апынуўся ў Харкаве. Вярнуўшыся ў Польшчу пасля вайны, пасяліўся ў Варшаве, пры гітлераўскай акупацыі працаваў у падпольнай сістэме асветы, у полымі паўстання страціў жыллё і ўвесь набытак з бібліятэкай уключна. Пасля вайны жыў тры гады ў Кракаве, потым вярнуўся ў Варшаву. Памёр 31 мая 1957 года. Слава яго, як сказаў паэт Мячыслаў Яструн, была насуперак уласнай прыроды — ціхай. Постаць Л. Стафа не засціла свету маладым, уплыў масцітага паэта на калегаў па пяры польскія крытыкі называюць празрыста-эфірным. Нават тыя з паэтаў, што адштурхоўваліся ад яго, спрачаліся, адчувалі на сабе зычлівы, паблажліва-сяброўскі позірк. Леапольд Стаф застаўся ў польскай паэзіі ўвасабленнем алімпійскай зраўнаважанасці, шукальнікам і выразнікам ідэі элінскай гармоніі, хоць часта быў у разладзе са светам і з сабою. Ён умеў і пад грукат грому, пошум навальніц захаваць спакой і раўнавагу духу: «Трымаюся левай рукой за зямлю, / Трымаюся праваю рукой за неба».

Паэзія Стафа ўвасабляла пералом часу і густаў, калі выдыхалася буяная, патрыятычная, крыху манерная, але з мужыцкім вострым пахам паэзія **Młodej Polski**, а мадэрнізм, што ішоў ёй на змену, яшчэ не прыжыўся на польскай глебе, там цанілася і прымалася перадусім патрыятычнае, а потым паэтычнае. Як гаварыў славуты піяніст Ігнацы Падарэўскі: «Спачатку Польшча, а потым музыка». Такім чынам талент Стафа быў асуджаны на шуканне новага, невядомага, на арыгінальнасць або мадзенне. Новы паэт здзівіў сучаснікаў майстэрствам сінтэзу, уменнем станавіцца і заставацца сабою, апіраючыся не толькі аб паэтычныя аўтарытэты, але і аб постаці філосафаў, мысліцеляў, вучоных, стваральнікаў новых канцэпцый сусвету і прадказальнікаў апакаліпсіса ды мажлівых перасяленняў зямное цывілізацыі ў іншыя галактыкі.

Маладому Леапольду Стафу характэрна значная ступень незалежнасці ад пануючых у элітарных асяродках міфаў, настрояў і моды.

Першы яго зборнік «Сны аб магутнасці», выдадзены ў 1902 годзе, нават у загалоўку нясе ўнутраную дыстанцыю ад моднага ніцшэанскага ўхвалення сілы, паэт пераносіць саму ідэю звышчалавека ў сферу сну, свабоднай гульні фантазіі.

Першыя канфлікты маладога паэта са знакамітымі польскімі крытыкамі Бжазоўскім і К. Іжыкоўскім аказаліся на паверку сітуацыямі непаразумення. Пошукі сябе ў лабірынтах ніцшэанства і мадэрнізму ўспрымаліся крытыкамі як перайманне, перапевы, стылізацыя, манернасць, адным словам, дабравольны палон, мёртвая зона душы. На справе ж Леапольд Стаф быў прыроджаным антыподам Ніцшэ, яго «Сны аб магутнасці» — гэта не касмічныя катастрофы са звальваннем багоў, нішчэннем слабых і шэрых дзеля прыходу звышчалавека. Магутнасцю паэт лічыў не заалагічную сілу інстынкту, а творчую фантазію, не жорсткую волю і разбурэнне, а само імкненне да ідэалу. Чын і мэта — спаўненні, яны за межамі мар, надзей, імкненняў, фактычна азначаюць канец жаданняў, а значыць, і сон ці смерць творчага духу.

Калі гаварыць ніцшэанскімі катэгорыямі, Леапольду Стафу імпануе не дыянізійскі багаборчы, а апалонаўскі вобразна-летуценны і творчы пачатак духу. Два першыя яго зборнікі «Сны аб магутнасці» і «Дзень душы» іскрацца юначым максімалізмам, жаданнем пражыць жыццё «буйное і святое». Найбольш тыповыя медытацыйныя вершы паэта шчыра, часта дзёрзка сумяшчаюць несумяшчальнае — ніцшэанскія пастулаты бязлітаснага багаборства з традыцыйным для польскай класікі хрысціянскім духам чалавекалюбнасці, пакоры і скрухі. Самабытнымі аказаліся вершы пра дзень будзённы, працавіты і рупны, гаспадарскі дзень з сярпом, касою, цэпам, плугам. Ад іх вее шчырай любасцю да простага чалавека з яго сціплым і мудра-змястоўным жыццём.

У вершы патрыяршага ўзросту «Аб карысці паломніцтва» чытаем: «Што ж ты рабіў? — пытае мая сястра.— Песенькі спяваў простыя»...

У трэцім зборніку «Птахам нябесным» Стаф востра адчувае і рашуча перадае боль і крыўду сацыяльных нізоў — «Стогн заклятых завулкаў». Паэт спрабуе падвесці сацыяльны ўціск пад канон апостальскай святой беднасці, адмаўлення ад спакус і жаданняў зямной раскошы. «Песенька валацугі» канчаецца афарызмам зухаватай бесклапотнасці:

«Dzień tam beztroski i słodka moc blada,
Słońce na obiad, Księżyc na wieczerzę».

Але толькі павярхоўны ці глухі да чужога гора чалавек не адчуе ў гэтых знешне жартлівых выслоўях болю, спагады, няёмкасці і міжвольнай віны за тое, што побач з людзьмі ўладкаванымі, задаволенымі з жыцця, пэўнымі ў сабе павінны жыць і людзі-птахі, жыць як набяжыць — з Божай ласкі. Вось гэтая прынцыповая недасканаласць, дваістасць свету і з'яўляецца прычынай духоўнага дыскамфорту, з якога вырастае паэзія таксама густа, як і з гарманічна ўладкаванага жыцця, толькі тая дысгарманічная паэзія з'яўляецца больш важкай, заглыбленай у сутнасць жыцця зямнога і нябеснага, чым паэзія «чыстая», занябесная.

І ў медытацыйных вершах Л. Стаф не выдае сябе за фрыгійскага мудраца, лірычны герой апынаецца перад супярэчнасцямі і загадкамі ўласнага ўнутранага быцця, шчыра прызнаецца, што няздольны пазнаць самога сябе: «Бо я, тварэц мовы,— уласнай не разумею душы».

Чалавек у Стафа выступае складанай, далікатнай і таемнай істотай, чые пачуцці, вера і розум часта знаходзяцца ў стане разладу або і вострых канфліктаў. Лірычны суб'ект як бы прывыкае да ўнутраных звадак, а ўсё ж шукае гармоніі, нават паказвае, як можна здымаць разлады і стрэсы. Бальзамам для ўзбуранай душы з'яўляецца аптымізм ці нават дэтэрмінацыя, зміранасць перад падсвядомымі імпульсамі, якія могуць апантаць чалавека і ўзяць уладу над здаровым сэнсам, пакрышыць этычныя ўстоі. Здараецца такое ў моманты скрайніх узрушэнняў, упадкаў духу, зрываў. Для такіх выпадкаў, як і для ўроджанай ці сацыяльна абумоўленай неразвітасці душ чалавечых, паэт захоўвае цярплівасць, хрысціянскую зычлівасць да бліжняга, літасць да ворага.

У многіх выпадках ён бачыць тут праяву Божай волі, канону.

Стаф, подобна як рамантыкі, гатовы ўступаць з Богам у перамовы, хоць не заходзіць так далёка, як, напрыклад, Міцкевіч, што патрабаваў у Бога даць яму ўсю ўладу над светам, бо паэт мае чулае сэрца і зможа ўладкаваць свет лепш, па законах сэрца, а ўладкаваны ён, на жаль, па законах халоднага розуму.

Л. Стаф высока цэніць чуласць, літасць, даравальнасць, спагаду — усё гэта асновы этычных поглядаў хрысціянскай дабрадзейнасці. Размовы з Богам у Стафа больш сцішаныя, чым у рамантыкаў і неарамантыкаў з-пад сцягу Маладой Польшчы, якая паслужыла Я. Купалу для стварэння вобраза Маладой Беларусі. Але і ён рашуча заступаецца за слабых, пакрыўджаных, няшчасных ад нараджэння, а таксама за тых, што не змаглі падняцца да вяршынь годнасці і цноты з-за сацыяльных умоў жыцця: «Глянь на тых усіх Тваёй ласкі вокам, / Што ёсць забедныя, каб мець цноты».

У перыяды абвастрэння сацыяльных канфліктаў аб'ектам гуманістычнага заступніцтва і апраўдання становяцца збунтаваныя людзі працы, нявольнікі, якіх паны жыцця даводзяць да атуплення, адчаю, дэмаралізацыі ды крывавага бунту. У моманты рэвалюцыйных выбухаў Стаф гатовы не толькі на адпушчэнне віны бунтарам і помснікам, ён дае рабочаму люду права на суд і пакаранне сваіх крыўдзіцеляў, уладкаванне свету паводле свайго масавага адчування справядлівасці. Сам паэт не раздзяляе рэвалюцыйных настрояў, але яго гуманізм, міласэрнасць распаўсюджваюцца і на задворкавыя, люмпенізаваныя элементы.

Пра іх, упаўшых і страціўшых воблік чалавечы, дапамінаецца паэт у Ісуса Хрыста: «Адпусці ім тое, што даў замала сілы». Што яны забедныя, каб маглі мець сумленнасць».

Стаф перажыў вялікія катаклізмы гісторыі і не прытвараўся глухім да злыбедаў жыцця. Праграмны верш паэта «Жыццё без здарэнняў» польская крытыка чамусьці ўспрыняла звужана, як згоду на малое шчасце. Недаацэненым аказаўся прыём антытэзы, уведзены ў канцоўку. Падключаны там фактар суб'ектыўнага бачання, асабістай уражлівасці кампенсуе малюнак бачанага:

Ды калі смерць мне заслоніць зрэнкі
Сваёю далонню лядачай,
Уцямлю, што бачыў я рэчаў мноства,
Якіх аніхто не бачыў.

Для ўражлівай душы і знешне дробнае, шэрае, малое поўніцца унікальнымі дэталькамі, парадоксамі, моцнымі ўражаннямі. Тут і вырысоўваецца сутнасць гуманістычнай місіі мастака: адкрываць вітальнае багацце чалавечага быцця ў малым і вялікім. Жыццё складваецца як з велічных і малых падзей, з'яў, здарэнняў, лёсавых канфліктаў, так і з вялікай або малой уражлівасці суб'екта, здольнасці і тонкасці ўспрыманняў. Само жыццё ў Л. Стафа — гэта рэчка, што мае дзве плыні: плынь здарэнняў і плынь таемных імпульсаў, успрыманняў, дзівосных мрояў. З фантастычнага перапляцення рэалій і ўяўленняў, здарэнняў, фактаў і іх суб'ектыўнага, інтуітыўнага ўспрымання ўтвараецца адзіная чалавечая рэальнасць — салодкі і горкі смак жыцця, яго сэнс і бяссэнсіца, радасць і боль:

У самім сабе настройваю разладжаны свет, Апалоне,
Бо, мабыць, для гэтага даў ты мне ліру ў рукі.

Антыномнасць рэалій быцця ставіць чалавека ў цяжкія, нават тупіковыя сітуацыі, падагравае або астуджвае яго інтэлектуальныя амбіцыі, прымушае не імкнуцца да абсалютных праўд і да універсальнага шчасця, а задавальняцца чымсьці даволі плынным, няясным ці прывідным. Шчасце выступае ў паэзіі Л. Стафа як далёка не адназначны стан душы, часам гэта даведзеная да кіпення вітальная сіла быцця («Танец Горы»), часам ціхае навучанне цноце, але таксама могуць быць шчасцем і цнотай неўсвядомленыя добрыя імпульсы душы. На пытанне, дзе шчасце, малады Стаф адказвае: «Паміж выцягнутай рукою і яблыкам на дрэве». Яблык у руцэ — гэта спаўненне, канец шчасця. Падобна разважалі мудрацы ў «Піры» Платона аб каханні, якое несла асалоду, пакуль не спаўнялася. І мудрая Дыятыма параіла вучоным мужам кахаць не жанчыну, а ідэю жанчыны, тады стан шчасця можа цягнуцца вечна, бо ідэя немінучая, а любоў да яе як да красы і гармоніі не ведае спаўнення і расчаравання. Падобна і ў Стафа, шчасце пры-

носіць не нейкае здарэнне ці тып рэальных жыццёвых імпульсаў, адносін, а хутчэй мроя, відзежы, сон, нейкі незямны транс. Так разуметае шчасце ўраўноўвае багатых з беднымі, шчаслівых з няшчаснымі. Шчасліўцамі аказваюцца вулічны валацуга, згвалтаваная і зацяжараная вар'ятка, не гаворачы пра прадстаўнікоў такой пачэснай прафесіі, як пастух.

У сталым узросце шчасце ўспрымаецца як прывілея маладосці і ўвогуле штосьці мімалётнае:

Шчасце, як дым, гіне, мінае,
Знікаюць мглістыя мроі.
Сапраўднасцю ж — толькі тое,
Што пасля ўсяго застаецца.

Сон, мроя, фантазія — гэта асноўны прыём паэтызацыі рэчаіснасці, яе эстэтычнага і этычнага асваення, уладкавання, гарманізацыі. Паэт не адвольна надзяляе быццё таямнічасцю, цудоўнасцю, містычнаю сілай, а вядзе да прынцыповай персаніфікацыі, з якой мы звычайна сустракаемся ў фальклоры, дзе адчуваць і думаць умеюць пясчынкі, а героі пераходзяць з явы ў казку, са смерці ў бяссмерце — у трэцяе райскае бытаванне без візаў і таможнага дагляду.

Прачытваючы сёння паэзію Л. Стафа, як ніколі раней адчуваеш дзіўную слодыч гармоніі, якою праменіць душа паэта. Гэта не алімпійскі спакой, а інтуітыўная надзея на лепшае, хоць жыццё здаецца кодлам мярзоты, цынізму і зла. Калі спрабуеш вытлумачыць гэтую блаславёную мудрую сцішанасць духу, дык заўважаецца натуральная дыстанцыя паэзіі ад палітыкі. Пачынаеш задумвацца, а ці сапраўды не найлепшы рэцэпт на сённяшнія дыскамфорты — узнясенне асобы чалавека над ідэалагічнымі шумамі. Але тут жа напрошваюцца контраргументы: Леапольд Стаф быў польскім патрыётам, твары ў у часы адчайнай барацьбы свайго народа за свабоду і незалежнасць і гэтыя грамадзянскія праблемы не абмінаў у творах, толькі падаваў іх пераасэнсаванымі ў кантэксце высокай духоўнасці, гуманізму, спажыткоўваў здабыткі неарамантызму і мадэрнізму, тых плыняў, на якіх ішла польская паэзія XX стагоддзя. Ён быў бліжэй да Скамандра, чым да Авангарда.

Скамандар, як сведчыць сама назва — рэчка, апетая паэтамі Элады — стаяў на антычных, парнаскіх прынцыпах

эстэтыкі і ўзносіў паэзію над штодзённасцю, асновай красы лічыў гармонію. У гэтым сэнс супрацьстаяння скамандрытаў левараэвалюцыйным мадэрнісцкім плыням, якія называлі сябе авангардам, дзёрзка ўводзілі ў паэзію з'явы, пазначаныя эстэтычным адмоўем. Рабочы і селянін былі суб'ектамі традыцыйна антыэстэтычнымі, зніжанымі, а мадэрністы наперакор традыцыі эстэтызавалі іх. Сялянскі побыт і крывавы бунт у «Слове пра Якуба Шэлю» Бруна Ясенскага, перакладзенага У. Жылкам на беларускую мову, перакананальнае таму сведчанне. Знамянальна, што эстэтызм і сімпатыі да Скамандра не стрымалі Л. Стафа перад увядзеннем у паэзію малюнкаў «жыцця без здарэнняў», нават жыцця, скарэжанага працай, сацыяльным беспрасвеццем, звырадненнем. Паказальным у гэтым плане з'яўляюцца вершы «Гной», дзе паэт вядзе палеміку з мяшчанска-пагардлівым ці канфузлівым стаўленнем да галечы, жабрацтва і сялянскай працы як рэчаў паніжаючых, агідных. Гной у Стафа мае пах цяжкі, але ж з'яўляецца канцэнтратам энергіі біялагічнага жыцця. Нешта падобнае можна сустрэць у Ясеніна: «А этот хлеб, што жрете вы, ведь мы его тово... с навозом». Хворая душою і дужая целам «Крыста з-пад плота» нагадвае чымсьці няэграбную, непрыгожую Марту, дачку ўваскрэшанага Лазара, у аднайменным вершы У. Жылкі, вабіць могуць і чыста «зямныя сілы»:

Прайшлі вякі... Яна ж адвечна
Ўсё тою ж буднасцю цвіце,
І я на думцы недарэчнай
Лаўлю сябе, як ты, Хрысце.

Канвою, на якой паэт любіць выяўляць свае філасофскія і маральна-этычныя ідэі, часта выступаюць евангельскія, біблейскія і антычныя грэчаскія міфы. Нярэдка да гэтага агульначалавечага матэрыялу падключаецца польскі нацыянальны фальклор, апрацаваны і ўзняты да ўзроўню патрыятычнай легенды рамантыкамі і паэтамі Młodej Polski, а пазней выкарыстаныя сімвалістамі і нават футурыстамі.

Цяжка бывае адрозніць у маналогах Л. Стафа раз-губленасць і скруху ад бравады: «Валацуга, кароль гасцінцаў, вечны піяк сонечнага святла ... лячу навыперадкі з дале-

чынёй і са зманлівасцю ў спаборніцтве, няверны ўсім праўдам і сам з сабой пасвараны». Можна сказаць, што да філасофскіх тэорый і нават да маральных запаветаў Стаф адносіцца з паэтычнай гарэзлівасцю, дазваляе музе не толькі падміргваць, прыжмурваць вока і цвяліцца з упэўненасці розуму, які не бачыць, што ў свеце процьма неспазнанага, недасяжнага, а «prawda jest w sobie dziwnie zagrobowa».

Уражвае ў паэзіі Стафа адкрыты буяны рэлятывізм, задзірыстыя спрэчкі пачуццяў з розумам, які прымае воблік то недаверка і вечнага спрэчніка-д'ябла, то скрушлівага дзівака-валацугі і ў такой якасці паднімаецца над пасваранымі эмоцыямі, выказваецца аб свеце і людзях у форме народных прымавак ці трапных выслоўяў, якія не прэтэндуюць на ролю ісцін абсалютных, хочуць быць праўдамі рабочымі, прыдатнымі для надзённых зносін і жыццёвай арыентацыі ў свеце. А свет застаецца надалей загадкай, плынь жыцця і зменнасць чалавечых лёсаў поўняцца супярэчнасцямі, выбухаюць абсурдамі.

На беларускі густ падабраў Алег Мінкін для перакладу багата пейзажных вершаў Л. Стафа, напісаных у ключы фальклорна-міфалагічнай персаніфікацыі раслін, жывёл і проста прадметаў: «Непраўдападобнае мора», «У старым садзе», «Восеньскі захад», «Сутонак замест дум прыйдзе», «Зімовая ноч» — матыў шматфарбны:

Нібы маленства рассейвае цуды.
Няма ні загадак, ні ілюзій марных.
І праўда ўсё. Усё ва ўсім паўсюднае.

Тут знікае мяжа паміж явай і казкай,
А каб людзі былі, не паверылі б пэўна:
Хвалі цягнуць далоні, гатовыя пляснуць...
Невідушчы Гамер крочыць з лютняю спеўнай.

Як бачна з прыведзеных строфаў, перакладчык зацікаўлены перадусім у пераводзе польскага паэтычнага тэксту ў беларускую паэтычна-вобразную канвенцыю, а яна ў нас перадусім фальклорна-напеўная. У гэтай сітуацыі браць курс на максімальнае тэкставае набліжэнне перакладу да арыгінала значыць знізіць чытэльнасць. Не шмат яшчэ ў нас чытачоў, добра знаёмых з усім багаццем поль-

скай канвенцыі аб паэтычных зносінах, якою віртуозна карыстаецца Л. Стаф.

Нават і пейзаж у Стафа не традыцыйна ажыўлены прысутнасцю чалавека, ён напоўнены драмай пазнання, што складае аснову філасофіі агульналюдскай мудрасці быцця. Паэт адказвае ўвесь час на пытанне: як захаваць пагоду духу, любоў да жыцця, калі яно такое скалочанае, шмат у чым неразумнае, абсурднае, а ўсё ж любае і дарагое. На жыццёвым фінішы Л. Стаф — мяркуюць біёграфы — паўтарыў загадкавы крок Талстога: спаліў усе прыватныя паперы і паехаў да вясковага, мала каму вядомага ксяндза, які ў часе Варшаўскага паўстання даў яму прытулак на плябаніі. Называюць гэта ўцёкамі ў смерць, забываючы, што няма такой мажлівасці ў паэта, які творчасцю міжвольна далучаецца да несмяротнасці.

У. Калеснік

СНЕГ

1

Бухматай, некранутай беллю,
Нібы дзявочаю пасцеллю,
Снег увабраў глухія гоні
Па самы бор блакітна-шары.
Пад покрывам зімы абшары
У ціхім бледным спяць палоне.

Блукаю зрокам па бязмежнай
Меланхалічнай пустцы снежнай,
І ранне дзён маіх паўстала
На папялішчах мёртвых, стылых,
Калі на лебядзіных крылах
Душы лілея красавала.

Плыву на хвалях успамінаў
У край, які даўно пакінуў,
І расплываюся ў прасторы...
...Сню, што душа свой белы вэлюм
Перада мною моўчкі сцеле
Бясконцым белапенным морам.

*1901**

---

* Датаванне вершаў у кнізе адпавядае часу іх надрукавання ў пажыццёвых зборніках вершаў паэта. *(Заўв. пер.)*

2

З імглістых даляў цёмна-сініх,
Дзе з полем зліўся небасхіл,
Па белай нерушы раўніны
Ідзе жабрак з апошніх сіл.

У зрэб'і, што ледзь крые цела,
Ідзе па цаліку сюды.
Пасля яго на снезе белым
Цямнеюць брудныя сляды.

І мне здаецца: прывід болю
Цераз душу маю ідзе,
Нібы па чыстым снежным полі...
І ў далеч я гляджу ў жудзе.

1901

СОН
НА КРЫЛАХ ЗМЯРКАННЯ

Калі думка, як чайка над морам,
Крылы стуліўшы, падае ў зморы
У ціхмяныя шаты спакою,
Я акно засланяю ў пакоі,
Апускаюся ў цёмныя воды
Адвячорка і ружаў п'ю водар,
І ў свой прыцемак клічу ўсё тое,
Што мяне чаравала сабою.

Абуджаецца свет таямнічы,
Усплываюць чароды абліччаў,
Дзіўных, прывідных і мімалётных,
Быццам дзень, што мінуў незваротна.

Ўсё, што гіне ў святле, ажывае:
У сутонні тугу разлівае
І на вочы зняможанай явы
Рукі сноў ускладае ласкава.
Крочаць дзіўныя прывіды ночы,
Глыбінёй зеўраць іхнія вочы,
Ціха, мякка, нячутна ступаюць,
Моўчкі палец да губ прыціскаюць.

Абуджаецца свет таямнічы,
Усплываюць чароды абліччаў,
Дзіўных, прывідных і мімалётных,
Быццам дзень, што мінуў незваротна.

Ажывае ўсё зыбкае, быццам
Той пылок матыльковы на крылцах,
Усё тое, што сее няпэўнасць,
Усё лёгкае, быццам павеўнасць

Срэбратканых бязважкіх фіранак
Ці містычных эфіравых тканак:
Быццам крылцаў пчаліных трымценне
Або шкельцаў вады зіхаценне
Над ракой ў вочках сеткі рыбацкай,
Шкельцаў, што прападаюць знянацку;
Усё гэта няіснае вельмі,
Быццам снегу павеўнага вэлюм,
Які перш чым да сонца прывыкне,
У віры мглістай замеці нікне.

Абуджаецца свет таямнічы,
Усплываюць чароды абліччаў,
Дзіўных, прывідных і мімалётных,
Быццам дзень, што мінуў незваротна.

З-за дзвярэй чутны голас напеўны
Ціхай лютні. Ля ног каралеўны,
У тузе, грае паж закаханы.
І гравюры абрыс філіграннны
Ў думках майстра ўстае без прынукі
Пад разцом залатым мерных гукаў,
Што сплятаюцца з тахтамі кроснаў,
Дзе прадзецца спеў лютні дзівосны.

Абуджаецца свет таямнічы,
Усплываюць чароды абліччаў,
Дзіўных, прывідных і мімалётных,
Быццам дзень, што мінуў незваротна.

Скарб каштоўнейшы, цуд вельмі рэдкі,
Чарадзейную папараць-кветку
Адшукала русаўка ў гушчэчы
Сонных дрэў і ляціць па сінечы

У сяйве павуты серабрыстай
На заручыны з месяцам чыстым.
Да грудзей белых зыркую кветку
Туліць, быццам тугі маёй сведку.

1901

СЛОТА

Імжака з ранку і да ночы
Плюскоча мерна і хлюпоча,
Бесперапынна, манатонна,
Бы енк калікі перадсконны.
Наўколле абляпілі хмары
Вільготнай каламуццю шарай...
Імжыць, хлюпоча дождж санлівы,
Сцяжэлы, моташны, лянівы...

Над шэраю вадою бруднай,
Разлітай па зямлі бязлюднай,
Сядзіць рахіт-нячысцік брыдкі,
Прамоклы да астатняй ніткі.
Свой велізарны, зжоўклы голаў
На грудзі звесіў, невясёлы,
Блукае соннымі вачыма
Па каламутным дне лагчыны,
І, ад макрэчы асавелы,
Б'е па вадзе рукой схуднелай,
І пырскі ў лужыне ўзбівае,
А нудны дождж сваё спявае.

Шрот крапляў сыпецца няхоццю
У вочы багны на балоце,
Сцякае па счарнелым плоце...
Аб дах стукоча без скančэння
І сее навакол стамленне
І непрытомнае здранцвенне...

Няспынны дождж без перабою
Шуміць, дудніць над галавою,

Дзесь вобліз хлюпае па слоце...
Пра штосьці мрою я ў дрымоце...
На беразе раўніны воднай,
Здранцвелай ад імжы нязводнай,
Думка ўсё кволей, непрытомней...
Ляцяць дажджынкі на чало мне...
Нячысцік ўсеўся нада мною,
У твар мне тыча мазгаўнёю,
На дне вачэй нечалавечых
Злаславы свеціцца агеньчык.
Набраклы тхлінай багны, ў вочы
Глядзіць з усмешкай патарочы,
І з бессэнсоўнасцю вар'ята
У хворы галаў мне зацята
Б'е зжоўклай, высахлай далонню
У тахт дажджу, што мерна звоніць
У лужынах краплістым шротам
Мелодыю апрыкрай слоты.

1901

ДЗІВАЦКІ САБОР

Поўны творчых пакутаў, у полымі дзікім
Невыцерпнага болю, з паглядам вар'яцкім,
Я хацеў у калос адзін скласці дзівацкі
Маёй бессані вобразы, фарбы і зыкі.

І на поце маім збудаваў небывалы
Храм, які прыгнятаў сваёй веліччу хмурай,
А знутры цыклапічныя высек скульптуры
З мармуровых адломкаў разца майго шалам.

Справы ўсе напісаў пэндзлем сноў на сцяне я.
Там мой боль у агоніі барваў яснее,
А з арганаў мой спеў цёмны льецца журліва.

Ды не можа ніхто зразумець гэтых дзіваў,
Я ж раскрыць іхні сэнс таямнічы не ўмею:
Творца, мовы душы сваёй не разумею!

1901

ЦАР

Сярод золата, кветак і бляску глазуры,
У раскошнай і тонкай усходняй саеце,
Я — паганец — уладца магутнейшы ў свеце
Спачываю ў палацы на тыгравай шкуры.

П'ю з гранёнага кубка ў аздобе з агатаў,
П'ю за моц сваю — хай яна вечна трывае!
Адзін рух мой лянівы — і свет замірае!
Мае дні — бесклапотнае, вечнае свята!

Няма ў свеце той рэчы, якой бы я прагнуў.
Маю ўсё... Ёсць, гавораць, дзесь людзі,
што ў багне
Смутку тонуць... Склікайце ў палац іх, рабы!

Стаць шчаслівым павінен галетнік любы!
Дам ім золата, лепшыя віны, каберцы
І маё неабсяжнае, добрае сэрца!

1901

ВОСЕНЬСКІ ДОЖДЖ

Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны,
Кастрычніцкі дождж, аднастайны, нязводны,
Б'юць кроплі няспынна ў асleплыя вокны...
Шкло плача і енчыць... а шыбы ў мгле мокнуць,
І сочыцца прыцемак шары дрымотна...
Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны...

Цямравым змярканнем дарэмна я марыў,
Што сонца на момант прагляне праз хмары...
Сплылі мае мроі ў абсяг папялісты,
Пустынны, бязмежны, халодны, імглісты...
Адзетыя ў чорнае зрэб'е журботы,
Шукаюць сваім дамавінам самоты,
Іх твары пакрыты, бы ценем, нудою...
Праз дождж яны сумнай паўзуць чарадою
У далеч, дзе лёс іх чакае жабрачы,
А ў вочы ім слёзы б'юць... Роспач там плача.

Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны,
Кастрычніцкі дождж, аднастайны, нязводны,
Б'юць кроплі няспынна ў асleплыя вокны...
Шкло плача і енчыць... а шыбы ў мгле мокнуць,
І сочыцца прыцемак шары дрымотна...
Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны...

Хтось кінуў мяне сёння ў дзень гэты слотны...
Хто? Не зразумець... Хтось сыходзіць, самотны...
Памёр хтось... Хто? Не адказаць на пытанне...
Хтось блізкі... Быў я на якімсь пахаванні...
Так... Шчасце ішло, ды злякалася змроку.
Хацеў хтось мяне пакахаць — за паўкрока

Сканаў, калі ўбачыў, што марна імкнецца
У сэрцы ачахлым раскласці цяпельца...
Жабрак прасіў міласць — памёр ад нястачы...
Дзесь дом разам з дзецьмі згарэў... Людзі плачуць...

Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны,
Кастрычніцкі дождж, аднастайны, нязводны,
Б'юць кроплі няспынна ў аслеплыя вокны...
Шкло плача і енчыць, а шыбы ў мгле мокнуць,
І сочыцца прыцемак шары дрымотна...
Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны...

Праз сад ішоў д'ябал у смутку пякельным
І сад мой зрабіў камяністай пустэльняй...
Ішоў ён, панура унурыўшы голаў,
І попелам кветкі прысыпаў наўкола,
Кілімы травы пазакідваў каменнем,
Трывогі і жаху пасеяў насенне...
Аж, спуджаны справай сваёй, лёг цяжарам,
Свінцовым, на тых скамянелых абшарах,
І тварам у дол, каб не чуў і не бачыў
Ніхто, ён слязьмі вогняпырскімі плача.

Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны,
Кастрычніцкі дождж, аднастайны, нязводны,
Б'юць кроплі няспынна ў асleплыя вокны...
Шкло плача і енчыць... а шыбы ў мгле мокнуць,
І сочыцца прыцемак шары дрымотна...
Аб шыбы дождж звоніць, дождж звоніць маркотны...

1903

ТАЯМНІЦА

Усе суздром
Мне адкрыты апоўначы спраты...
Блакітным сном
Майго парку яснеюць прысады...

За цёмны ствол
Стала ціша і там застыла,
І вочы ў дол
Апусціла, і слых навастрыла...

Вунь напрасцяк
Смерць спяшае, каб не спазніцца...
Пахне мярцвяк...
Каса з кузні, новая, льсніцца...

У шатах дрэў
Грае хтосьці аслеплы ад плачу...
Сёння памрэ...
Бо ўжо лепшае спеў даастачы...

Птах у траве
Сваю матку ніяк не знойдзе...
Дарма заве...
Больш ні слова аб той прыгодзе...

Знаю, што сніць
Лес, бо час начны, цудаў поўны,
Даўно глядзіць
На мяне ясным вокам поўні.

Даўным-даўно
Глухамань мяне цішай суроча...
Пакуль не відно
Пакахалі мяне чары ночы...

Ноч пакрысе
Сыпле ўглыб мне прызнанняў дукаты...
Адкрыты ўсе
Мне апюўначы дзіўныя спраты...

1903

ПРЫЙСЦЕ

Ліповым кветам, ліповым лісцем
Парог ўвабраў я на тваё прыйсце.

Віном заставіў, нібы на свята,
Свой стол, каб госцю прыняць у хату.

Кілімам ложак заслаў адрання
На тваё прыйсце, на прывітанне.

Мае абдымкі, мае цалункі
Табе хаваю, як падарункі.

Пасля разлукі, што сушыць, нудзіць,
На дзень сустрэчы... якой не будзе.

1905

ЕНК ВЫКЛЯТЫХ ЗАВУЛКАЎ

О Божа! Марна ўсё, усё навокал,
Як літасць, што лье слёзы над бяднотай,
А думка шкандыбае ў шчытным змроку,
Нібы сабака, выгнаны на слоту.

Гаротны вечар, ранак невясёлы,
І да пакутаў сэрцы ўсе глухія,
Як да малітваў жабракоў касцёлы...
На вусны мае, Божа, глянь сухія!

Зноў восень крочыць па глухіх завулках
З нудліваю, як боль зубны, тугою,
Як хлеб жабрацкі з вотруб'я ці мулкі
Валун той у журбы пад галавою...

І дрэнна ўсё на гэтым млосным свеце...
Без сну і без надзей ляжу, аглухлы,
І боль, як стрэмка, хворы дух вярэдзіць,
І сплюшчыць не магу павек апухлых.

Згалелых дрэў я чую енк бясконцы,
І думкі мае сумныя, бы слота,
Бы прыгарад, дзе не бывае сонца...
Ідзі, о Божа, за маёй журботай...

Сабакам вые сэрца!.. Хрысце любы!
Скуль моцы ўзяць?.. Зірні на люд мізэрны!
Брыда і зайздрасць, быццам рак, іх губіць —
Ах, і нікога — з сэрцам чыстым, верным!

Ты, Божа! Нэндзы брыдкія напоі
Не паднасі рабам Тваім! Укленчаць
Ад голаду мацней, калі ў спакоі
Пакінеш іх — няхай іх роспач лечыць!

Спазмы пажады грубай людцаў надзяць
І гоняць у прытон з распуснай дзеўкай!
Карчомная нара, бы тая сваццця,
Зваблівае іх віном і спеўкай!

Вунь у рыштоку вуліцы бязлюднай
Бадзяга спіць... У твар зірні, о Божа!
Нічога там, апроч пажады бруднай,
Як надпіс з брыдкіх слоў на агароджы!

Каханне зганьбаванае адпомсціць
Не можа ўжо таму, хто стаў здабычай
Хваробы, што яму паточыць косці,
У брацтва ночы і нажа залічыць!

І сядзе ён за краты напаследак!
Шпіталь у лепшым разе ці прытулак!
Такі канчатак безнадзейных кветак,
Якія песціць выклятты завулак...

Звыродлівы падкідыш ля парога —
Гэта таксама пчолка з Тваёй борці:
Няшчасны ідыёт, дзіцятка ўбогай
І п'яніцы, зачаты на ашмоцці!

За ўсіх падонкаў, клятых і мярзотных,
Знянацку кулаком абразы бітых,
Няхай гучыць жахліва і маркотна
Мая малітва грубая, бы крыўда!

1905

РАНА

Сотні змораных наймітак-ткалляў нядрэмна
Мне тканіну на плашч пурпуровую ткуць,
Сотні сумных, худых кавалёў пад'ярэмных
Залатую карону мне ў лёхах куюць.

Я, кароль, быў паранены ў бойцы няроўнай,
Калі выйшаў, без зброі, за вас пад удар...
І за гэта каленямі вы перад тронам
Ямку выцерлі: бо незагойны мой шнар.

Боль на твары маім... Рану плашч засланяе...
Усміхаюся, толькі калі не відно
Тым, хто ніцма ляжыць... І ніхто з вас не знае
Пра спахоўнае дзіўнае дзіва адно...

Немагчыма займець сабе большай пашаны!
Вас жа плашч і карона чаруюць здаўна...
Калі б плашч расхінуў і адкрыў сваю рану —
Вы ўскіпелі б: даўно зажыла ўжо яна!

1905

ПРА ДОБРУЮ НОЧ

А тых, хто ў сэрцы чуласць песціць,
Душою кветкі рассявае,
А тых, хто ў сэрцы чуласць песціць,
Ноч пад сваё крыло схавае.

Ноч, што да споведзі схіляе,
Занурылася ў глыб нябёсаў...
Ноч, што да споведзі схіляе,
Срабрыстым зоркам чэша косы...

На росны дол кладуцца цені
Дрэў, ззяннем месяца ўвабраных...
Ад дрэў на дол кладуцца цені,
Нібы ад сненняў срэбратканых...

Спагадным пацалункам змроку
Ноч жальбам слёзы выцірае...
Спагадным пацалункам змроку
Снам цёмным вочы раскрывае...

І столькі злагады ў паглядзе
(Нясі цяжар свой прэч, о гора!)...
І столькі злагады ў паглядзе,
Нібы ва ўсмешцы цяжкахворай...

На срэбравейным твары ночы
Сні шчасце зорак... Без трывогі...
На срэбравейным твары ночы
Адпачываюць рукі Бога...

1905

САМОТНАЯ ВІЛА

Я даўно прадчуваў гэты цень, што жальбою
Лёг на наша каханне. Згадай, як з табою
Мы ўздоўж мура ішлі, з-за якога свяціла
Сваёй беллю, у квецені тонучы, віла,
Апавітая пахам і цішай глыбокай.
На нябёсах ружовыя гаслі аблокі,
Змерк блакітны гусцеў, напаўняў нас журботай.
Сталі мы каля крата́ў сцямнелых варотаў
І ў маўчанні занурылі нашы пагляды
У глыбокі паўзмрок таямнічага саду,
У якім закаханым прызначана прасці
У абдымках пяшчоты бясхмарнае шчасце.
Мы ўзіраліся ў сад, і здалося нам, быццам
Ён чакаў тых, хто прагнуў у цішы забыцца,
І быў спратам, якога нам так не ставала.
Браму пхнула міжволі рука і... апала.
На замку была брама. І ты пабляднела,
Бо, відаць, як і я, у той міг зразумела:
Той павалены помнік Гермеса за брамай,
Што яснеў у сутонні бялюткаю плямай
На зялёным ядвабе травы, як груд снегу,—
Быў пасланцам кахання і згоды, што ў бегу
Браму ў сад нам хацеў расчыніць, ды не здужаў,
Паваліўся ў траву, быццам сцятая ружа,
І пакінуў дваіх нас, тугой ахінутых,
Перад брамаю светлага шчасця — замкнутай.

1908

ЦНАТЛІВЫЯ БЯРОЗЫ

Бярозы лісцяў залатоўкі
Скідаюць на смарагд травы.
Праз сетку голля сінім шоўкам
Глядзяць нябёсы і ставы.

Пагодна рана льсніць паляна.
Ціхмень мілуе станы дрэў,
Шамрэннем крон закалыханых.
Траву ледзь-ледзь крануў павеў.

Паўсюль так ціха і салодка,
І дзіўна так, бы наяву
Ты толькі што прайшла тут лётка,
Хіснуўшы сукняю траву.

1908

ПРАЗ ПАРК ЮНАЦТВА...

Праз парк юнацтва першы раз
Іду я восеньскай алеяй.
Як нікне час, як нікне час.

Лісцё згалелых ліп жаўцее,
Ляжыць на сцежцы сіні цень,
І з двух бакоўствалы чарнеюць.

На лаўцы, дзе дрыжыць прамень,
Спыняецца знячэўку вока...
Мы тут сядзелі ў той дзень...

Праходжу міма шпаркім крокам.

1908

ПРОСЬБА АБ КРЫЛАХ

Ёсць дзіўны край за сіняю затокай,
Тым недасяжны, хто лятаць не можа.
Ён пад павекам неба спіць як вока,
Якое бачыць ззянне думкі божай.

Калі ж танулі мы ў лятунках гожых,
Схаваўшыся ў густым цяні ад спёкі,
Пачулі ў шатах дрэў ледзь чутны пошум
Пра дзіўны край: «Далёка ён! далёка!»

Уночы ходзім мы над той вадою
І з палатна шатры там разбіваем,
Дзе вецер ловяць вербы ў нерат голля,

І ўзносім наша сэрца маладое
Да зор, што нашым свецяцца адчаем,
І, каб далі нам крылы, ціха молім.

1908

ЗМРОК

Змрок сцішыў у душы стамлёнай
Мой смутак неўтаймоўны.
Усплыў над возерам замглёным
Шчыт залацістай поўні.

І, сеючы спакой між зорак,
Над галавой маёю,
Ён мые свой бурштын празоры
Блакітнаю вадою.

І нечакана зазіхцела
Тое, што сны хавалі:
Тваё бурштынавае цела,
Халоднае, бы хвалі.

1910

ХРЫСЦЯ З-ПАД ПЛОТА

Хрысця з-пад плота! Добры дзень!
Хвала і чорта справам!
Цябе я ўслаўлю між людзей,
Бо вартая ты славы.
Вітаць мне тройчы, Бог, дазволь
Цябе — і чорту свечка:
Даў д'ябал смех, а Бог даў боль,
І доўжыцца іх спрэчка.

...Заквітнелі лілеі і ружы кахання...

Хрысця з-пад плота! Але рот
Твой крывіць смех бядачы,
Калі дзіцятка ты сярод
Анучак брудных няньчыш,
Калі спяваеш, а твой зрок
Перад табой блукае
І калі скача лёгкі крок
І зрэб'е ў тахт гайдае.

...Зноў вясны панаванне...

Хрысця з-пад плота! Ты здавён
На могілках, як дома...
Жагнаешся, калі б'е звон —
Навошта невядома.
Калі ты ходзіш басанож,
Дык валасоў салому
Палошча вецер, мые дождж
І асвятляе громам.

Хрысця з-пад плота! Ўладцаў двух
Раздор хістае неба.

Хоць пераможа светлы дух,
Ды б'юць абодва цэпам.
І покуль зоркі свецяць нам,
Ніхто з іх не саступіць.
Нявінная? Ды трэскі там
Ляцяць, дзе дрэвы рубяць.

Хрысця з-пад плота! Бог даў боль,
Каб потым даць заслугу.
Жыццё не мёд — на ране соль...
Ды д'ябал даў кальчугу
Ад крыўдаў тых, што б'юць наўпрост
Баксёрскаю пальчаткай.
Наканаваў Бог жорсткі лёс,
А чорт зрабіў вар'яткай.

Хрысця з-пад плота! Чорт нанёс
Агромністую шкоду:
Тужыць не можаш і ліць слёз —
Не будзе ўзнагароды.
А Бог жа наканоўваў шлях,
Шлях да збавення рэдкі,
А ты спяваеш, быццам птах,
Бязведная, як кветка.

Хрысця з-пад плота! Андарак
Твой згніў даўно дарэшты.
Тваё рыззё цябе, аднак,
Нікольні не бянтэжыць.
Хоць цёмны кут турмы, хоць роў —
Смяешся бессэнсоўна
І шчэрыш белы рад зубоў
Між вуснаў паўнакроўных.

Хрысця з-пад плота! Лотр-злыдух
Табою авалодаў...

Кроў не вада, а ён быў зух:
Пагналі прэч з гасподы.
Разгледзелі гаспадары
След пешчаў — і ў канаве
Ты стала спаць ад той пары
На скошанай атаве.

Хрысця з-пад плота! Рэдкі дзень
Нясе такую ўдачу:
Ты ж увайшла адразу ў цень
Заслуг у лесе плачу.
Той, хто збавення прагне, тут
Сцярпець павінен многа.
Абы не ўкленчыць ад пакут...
Прызначана так Богам.

Хрысця з-пад плота! Злая рэч
І марныя — пракляцці.
Той, хто з табою быў, збег прэч,
Калі ты стала маці.
Бог табе новы зычыў крыж,
Каб несла ты ў няшчасці.
Але ж ты пачала заміж
Таго — нябёсы клясці.

Хрысця з-пад плота! Але ж час
Прыносіць цвет пакоры.
Калі згінае ноша нас,
Шукаем мы падпоры.
Для большых мук была табе
Разам з дзіцём нястача
Пасланая, а ты ў клятцьбе
У свет пайшла жабрачыць.

Хрысця з-пад плота! Свенты Пан
Дасведчвае ўлюбёнцаў.

Сасмяглы хоча піць? Ты збан
Разбі — дай лепей воцат.
Калі судзілі за крадзёж:
Жабрачка — значыць, крала!
Ты ў гэты час найлепшы — што ж? —
У знемажэнні ўпала.

Хрысця з-пад плота! Увесь грэх —
Ад плоці! Калі ўстала,
Заскрыгатаў твой дзікі смех
Нажоўкай па метале.
З падзякай трэба легчы там,
Дзе цябе валіць доля,
Ты ж? ашалела неўпрыцям...
На ўсё гасподня воля...

Хрысця з-пад плота! Не да дна
Ты выпіла ўсе беды.
Трэба ж за голадам спаўна
І сорам з ганьбай зведаць.
Ты перакрэсліла шлях мук
Так добра распачаты.
Што сёння? Літасць з божых рук.
А быць... святой магла ты.

Хрысця з-пад плота! Не адзін
Раз неслухам зацятым
Гасподзь паможа! Хоць правін
З іх кожны меў багата.
Калі той грэшнік, што памёр
З абжэрства, перад брамай
Нябеснай стане — прыгавор
Будзе яму той самы.

Хрысця з-пад плота! Шкода, жаль,
Што нэндзу ты зазнала,

Што голад драў нутро, як сталь,
А ты, аднак, не крала.
Саскі тваіх грудзей пустых
Ротам дзіцё хапала,
Няспынна крычучы, а ты
Яго не забівала.

Хрысця з-пад плота! Проста так
Цябе нагой з размаху
Біў бліжні твой, а ты ў камяк
Сціскалася ад страху.
Не раз цябе пагляд апёк
Чыйсь дзікі, ды ў адплату
Яму ты ў непраглядны змрок
Не падпаліла хату.

Хрысця з-пад плота! Ты ў слязах
Не адзін раз мінала
Публічны дом, хоць па начах
Там музыка гучала,
Хоць там знайшла б ты цёплы кут,
Адзенне і дастатак,
Ды ты абрала холад, бруд,
Каб не кахаць за плату.

Хрысця з-пад плота! Я спасціг
Цяпер, што ёсць нямнога
Сярод жанчын такіх святых
І чыстых перад Богам.
І не таму, што ты жыла
Па запаветах божых:
Ты ні адной віны і зла
Насіць ў сабе не можаш.

Хрысця з-пад плота! Я празрэў!
Ўсё проста да смяхоты!

Цяпер я цалкам зразумеў
Загадку тваёй цноты!
Я здолеў яе сэнс раскрыць:
У нашым свеце клятым,
Каб цнотным, як ты, Хрысця, быць,
Патрэбна быць вар'ятам.

Хрысця з-пад плота! Як жа мне
Прыйшло на думку гэта?
Ксёндз жа за грэх такі кляне
І грозіць апраметнай.
Бо ёсць жа Бог! Бо ёсць жа Бог!
А значыць, я святую
Дарогу кінуў між дарог
І не туды прастую.

Хрысця з-пад плота! Дух твой мог
Забыць пра паслушэнства
Ад мук: які ж спагадны Бог,
Што даў табе шаленства!
Ён не схацеў цябе пазней
Судзіць, што ты без меры
Яго кляла (няма страшней
Граху, чым быць блюзнерам).

Хрысця з-пад плота! Чэсць Яму,
Аднак і чорту свечка.
Пей песні байструку свайму,
Мілуй свайго малечу.
І ўдзень, і ўноч твой смех чуцён,
І вырак ёсць вышэйшы,
Ды шал вышэй: табе даў ён
Быць ад сябе мацнейшай!..
... Заквітнелі лілеі і ружы кахання...
...Зноў вясны панаванне...

1910

ВЯСНОВАЙ НОЧЧУ...

Вясновай ноччу, сярод руж,
У срэбным ззянні поўні,
Я слухаю нямую глуш,
Што снамі грудзі поўніць,
І раптам праплылі між дрэў
Тваіх адзеж аблокі
І загучаў твой ціхі спеў...
Так мне здалося ў змроку...

А птах пяе ў галлі бяроз,
Нясецца спеў па перлах рос,
Пад серабрыстым ззяннем
Душа гарыць каханнем.

А ты, як тая кветка-здань
У снегавым адзенні,
Плывеш сюды, у глухамань,
У бледна-сінім льсненні,
Далонь на вочы мне кладзеш,
Смяешся ясным смехам,
І радасць, што не мае меж,
Звініць наўкола рэхам.

А птах пяе ў галлі бяроз,
Нясецца спеў па перлах рос,
Пад серабрыстым ззяннем
Душа гарыць каханнем.

Мяне прытульвае далонь
І мяккасць кос дзявочых,
Я да цябе схіляю скронь
І бачу твае вочы.

З чала цень смутку нікне ўраз,
І так, нібы навекі,
Злучае пацалунак нас —
...Расплюшчваю павекі...

Ах, гэта змоўк салодкі спеў,
Упала колькі кропляў з дрэў,
Ды бачыў тыя слёзы
Адзін туман бялёсы.

1911

АД ТЛУМУ МЕСТА...

Ад тлуму места, з вуліц цесных,
Што ўдзень тугой і дымам точаць,
А ноччу сон даюць гарэсны,
Што яшчэ болей цемніць вочы;

З пакоя змрочнага, дзе ў цішы
Я з болем быў сваім сам-насам,
Пад вольныя нябёсы выйшаў
Да гэтых дрэў, да гэтых красак.

Ды быццам за хаўтурным шэсцем
Іду! І боль пячэ жахлівей:
Між гэтых дрэў, на гэтым месцы
Я калісь быў такі шчаслівы!

1911

ВОСЕНЬСКІ ТУМАН

Туман бялёсы валачэцца
Між рэдкіх дрэў па полі
І быццам на дыбках крадзецца,
Каб не вярэдзіць болю.

Ды боль не спіць: бо сэрца мроіць
Аб страчаным, якое
Галосіць нада мной і поіць
Атрутнаю вадою.

Сон аб табе прадзецца жалем,
На шрам слязьмі цярусіць...
Ды будзе яшчэ болей джаліць
Боль, калі я прачнуся.

1911

СМЕРЦЬ ВАНДРОЎНІКА

Пад самотнай, рассечанай громам сасною,
На імжы, у сутонні, якое здалёку
Цягне па-над лясамі пахмуры плашч змроку,
Каб зямлю затуліць, як цалункам, імглою:
Я, вандроўны бадзяга, упаў ад знямогі.
Ля мяне побач лёг толькі кій мой дарожны.
Спрацаваныя ўрэшце я выпрастаў ногі
І канаю. Бо тут мой прыстанак апошні.

Толькі кій пры мне, сябра мой верны, адзіны,
Я да сэрца яго прыцiскаю рукамі.
Галава — на грудку, ускапаным кратамі,
А сярмяга расхрыстана, каб халадзіла
Мае грудзі, сухія ад смагі, дажджамі.
Погляд, мглою засланы, у неба занурыў —
Там вачам маім сонца свяціла гадамі
І ўсміхалася далеч бязмежнай лазуры.

Вочы-вочы, вы шмат перабачылі рэчаў
Пекных, як чужы горад ці рукі жанчыны,
Снілі сны, што былі як адбітыя ў рэчцы
Храмы, скалы і белых садоў аблачыны,
А цяпер вы ў захмараным бачыце стэпе
Струны слотнай залевы, якімі вятруга
Мые бледны мой твар, студзіць грудзі і трэпле
Валасы пасівелыя, стогнучы глуха.

Гэй вы, хмары — нястомныя крылы лятункаў,
Маякі вечнасумнага сэрца бадзягі,
Сэрца, што ад сіла звабных даляў ратунку
Не шукала й спазнала спаўна ўсе абсягі —

Па бязмежжы вяслуйце, плывіце ў прастору,
Я ж хоць трохі яшчэ цьмяным позіркам буду
Пільнаваць, як імчыце за пушчы, за горы
Ў недасяжны мне край, поўны чараў і цудаў.

Вейце, поўдня вятрыскі і поўначы віхры,
Вы гасцей мне вялі і ў пагоду, і ў негадзь
Да крыніцы з гаючай вадой без аддыху,
У якой рэха плачу змяняецца смехам;
У той край, дзе я столькі пра шчасце ўспамінаў
На кары дрэў пакінуў у вёсках спатканых,
Бо я з тых, хто на ганку бацькоўскай хаціны
Пасля доўгіх вандровак стаіць непазнаны.

Дзякуй вам, раздарожжы гасцінцаў бясконцых,
Хмары, віхры і ў полі таполяў прысады,
Дні і ночы, усходы і заходы сонца,
Сны пад небам і сцежкі квітучага саду,
Ціхамірныя хаты і злыя падворкі,
Смуткаванні й вяселлі, блуканні і мэты,
Камяні пад нагой і высокія зоркі,
Льды і краскі духмяныя, зімы і леты.

Шмат у скарбніцу сэрца схаваў я прыгодаў,
Як галубка хавае пасланні пад крыльца,
Быццам брат, ішло поплеч жыццё, а наводдаль
Смерць ішла і ціхутка іграла на скрыпцы.
Я ішоў лёгкім крокам з той музыкай спеўнай,
Бо лічыў, што смерць знае, куды я прастую,
І мой зношаны плашч развяваўся павеўна
На вятрыску, які сцюжай грудзі гартуе.

Дык танцуйце, туманы! Спявайце, вятрыскі!
Так, як пеў і скакаў я ў аквечаным маі!
Хоць цямнее ў вачах і струмені з хмар нізкіх
Твар сякуць — вы танцуйце, пакуль скрыпка грае.

Бачу панну ў залеве: па струнах срабрыстых
Яна водзіць вясёлкай і бліскаюць стрэлы
У капе валасоў яе чорных агніста...
Як мне добра! Ад грання душа захмялела!..

Быццам з мёду яе мяккагучныя струны...
О, танцуйце, туманы! На золаце хмары
Паўстае дзіўных местаў дзівосны малюнак,
Старабытных лясоў і садоў, поўных чараў.
Мае згадкі і сны, быццам фата-маргана,
Усплываюць: сябры, сёстры, родная вёска,
Воблік страчанай ў даўнім мінулым каханай...
О! яна ў небе грае на скрыпках анёльскіх...

Мае сны, як статуі, мяне атачылі,
Стужкі рэчак блакітных і белых гасцінцаў,
Дзе не раз я хадзіў і якія вачыма
У смузе даляглядаў шукаў — прытуліцца
Да мяне хочуць самі. Сыходзяцца ў ззянні
Да мяне ўсе сцяжыны мае і дарогі,
Пазасланыя, быццам на Тройцу уранні,
Сітнягом мяккім, каб не параніў я ногі...

Дай мне спеўную скрыпку, о белая панна!..
Я ўстаю і іду! А за мною картэжам
Усе сны мае рушаць у край неспазнаны —
Юнакі і дзяўчаты ў павеўных адзежах,
І дарогі віюцца у сонечным ззянні,
Як вужы за Арфеевай лірай святою,
Каб са мной быць у вечным маім Вандраванні...
Ўсё навокал блакітнае... Ўсё залатое...

1911

ПАГОДНЫМ ДНЁМ...

Пагодным днём журботай
Празрыстай ахінуты.
Жаўцеюць копаў юрты
У бляску сухазлотым.

Сярод лугоў спякоты
Каровы ходзяць гуртам.
Спяць хаты. Вецер скуты
Салодкаю дрымотай.

Застыла наваколле.
А ў цёмна-сінім полі,
Дзе промні сонца льюцца,

У шчасці шчасце крочыць
І паглядзець не хоча
На небаракаў-людцаў.

1914

ХВІЛЯ

У залаты, спякотны поўдня час
Паіў калодзеж у квітучым садзе нас.
Пілі з вядра ў задуме
Сцюдзёную ваду мы.

Потым у глыб крыніцы паглядзелі мы,
Скуль веяў нам у твар замшэлы зруб турмы:
І ўбачылі галовы
У квецені вішнёвай.

Яшчэ глыбей, за калыханнем белых дрэў,
Імклівым ценем птах бясшумна праляцеў,
Мы паглядзелі ўгору
У сінюю прастору.

Птах знік... І маладосць, вясна сплывуць, як дым...
Кахання жар гарыць у поглядзе тваім...
У студню капае вада,
Бы хвілі, якіх нам шкада...

1914

О, СТРУНЫ ЎСПАМІНАЎ...

О, струны ўспамінаў, звініце вы ад дакрананняў
Балючых маіх сенажаццю і цішай змяркання.

Я бачу зноў белую хату, два цёмныя клёны,
Спеў птаха ў галлі, позні вечар, туманам замглёны.

Усё, што пакінула мне тое шчаснае лета:
Два дрэвы і птах у галлі... ах, адно толькі гэта.

1914

КАХАЦЬ І ГУБЛЯЦЬ...

Кахаць і губляць, прагнуць і расставацца,
Адпрэчваць і ўмольваць «вярніся назад!»,
І падаць балесна, і зноў узнімацца —
Вось наша жыццё: і нямнога, і шмат...

Збягаць у пустэльню за мараю дзіўнай,
За перлам дзівосным скакаць у раку,
Каб тут пасля нас засталіся адзіна
Кругі на вадзе і сляды на пяску.

1914

НОЧ

Урачыстасць ціхай ночы лета
Сэрца ў слодыч чараў спавівае.
З поля мяккагучны голас флейты
І бруенне рэчкі далятае.

У сутонні зорным лес далёкі
Цёмнай хмарай высіцца ў зняменні,
А за лесам залацістым вокам
Сочыць поўня, быццам блаславенне.

1914

МНЕ НІШТО НЕ ЗАМУЦІЦЬ...

Мне нішто не замуціць красы тваёй, свеце!
Слаўлю роднае племя, з якога узрос я.
Бачу россыпы зор і палёвую квецень
І яднаю паглядам зямлю і нябёсы.

І хоць гэта ўсё дадзена мне на імгненне —
Маю радасць цень смерці не зганіць адчаем.
Я тут вечнасць не быў да майго нараджэння,
А мудрэц, што я — смертны, спрадвеку сцвярджае.

1914

ДОЖДЖ КРЫВІ І АГНЮ

Дождж крыві і агню, справядлівая кара,
Спапяляе зямлю, як Садом і Гамору!
Перапоўнена з верхам цярплівасці чара,
І злачынствы даўно перавысілі горы.

О, зямля, цябе ў серы распаленай топіць
Вырак суднай гадзіны за шал твой зацяты,
Ты другой Нінявіяю стала, Еўропа!
«Вінаватая!» — коцяцца грому раскаты.

Красавала ва ўборах з хлусні й беззаконня.
Патанала ў распусце, сыцела ў раскошы
І блюзнерыла, поўная пыхі, з амбона:
«У нас сіла і золата! Што нам страх божы?»

І адплата нябесная лінула ліўма
На распусту тваю — і ўзраслі з папялішчаў
Кветкі полымя, чорныя купіны дыму,
І караючы меч без разбору ўсіх нішчыць.

Камяніцы і гмахі згарэлі, нібыта
Ільняныя шатры, ніва пусткаю стала,
Першародныя дзеці твае перабіты
І спіхнуты Цялец Залаты з п'едэстала.

Свет пыхлівы — зламаны, бы тонкае дрэўца —
Есць хлеб роспачы чорны і п'е віно скону,
І ў крыві, што дымлівым патокам ліецца,
Першы раз у жыцці сваім прагне Закону.

Чалавецтва, што сёння здаецца вампірам
Сваёй моцы ўчарашняй і страшнай чмурою,
Свае шаты падзёрла, запрагнуўшы міру,
І пакрыла сваю галізну канаплёю.

І, як плачка-ўдава, выціраючы ў скрусе
З твару цёмнага слёзы адчаю і жалю,
Разграбае пакорліва попел над друзам
І збірае абломкі разбітых Скрыжаляў.

1918

МЫ ЎСЁЙ ДУШОЮ ТАМ...

Мы ўсёй душою там, хоць тут мы, поруч,
Хоць вам відзён наш кожны крок і рух,
Мы там, дзе цёмна-сінія прасторы
Хвалююць позірк і займаюць дух.
Далёка мы ад вас цяпер, далёка —
За трыдзевяць зямель, за царствам змроку.

Мы ўсёй душою там. Хоць тут нам будзень
Усё чарсцвейшы хлеб ў руку кладзе:
Не голад нас, а даўні смутак нудзіць
Па браме той, што ў родны дом вядзе.
І варта ўвечары нам змружыць вочы,
Як сэрца ў браму родную стукоча.

Мы ўсёй душою там, дзе ў полі крэсліць
Разоры першыя араты-жыццялюб,
Дзе пасля бойні акрыялы цесля
На папялішчы ставіць новы зруб,
Дзе бусел, што прынёс вясны суцехі,
Буслянкай свежай карануе стрэхі.

Мы ўсёй душою там. Хоць светлатвары
Дзень бачыць нас закінутымі ў тлум,
Ды знае ноч, як у бяссонных марах
Мы ловім чуйным слыхам ветру шум,
Што мовіць нам пра вольную радзіму,
Нам, хто па кіі тужыць пілігрыма.

1918

ПЧОЛЫ

Залатыя князёўны, увішныя пчолы,
Служкі верныя працы і мудрасці боскай,
Трункам Пяста гасцінным вы поіце вёску,
Здабываеце свечкі пабожным касцёлам.

Богам дадзена вам зведаць слодыч пялёсткаў
Пахкіх кветак і горкасць дурманлівых зёлак:
Людзі гэтак жа цешацца хвіляй вясёлай
І гаруюць, спавітыя скрухаю жорсткай.

О, дзявоткі з вуллёў, мёдам поўніцца келіх —
Слодыч зёлак і слодыч жыцця ў ім бруіцца
І на клейкія вусны цячэ ў час вяселля.

А гаркота жыцця разам з горкасцю зелля
Воскам робіцца светлым, бы твар у чарніцы,
Мяккім воскам, з якога смерць лепіць грамніцы.

1919

БУЛЬБЯНОЕ ПОЛЕ

Пад небам, што імжой цярусіць сонна,
На соймы ляціць жалобны грай грачыны
І развінае крылаў парасоны
Над полем, дзе цярплівыя жанчыны

У яркіх — разнаколерных — хусцінах
На бульбяных разорах несканчоных
Матыкамі працуюць без спачыну,
Упёршыся нагамі ў дол сцюдзёны.

Прамоклыя, схіляюцца адранку
Над высахлым націннем парабчанкі
І з-пад няглыбкага карэння рупна

Збіраюць бульбіны, бы яйкі з-пад нясухі,
І кідаюць у кошыкі, што глуха
Марш восені выстукваюць, як бубны.

1919

СНЕГАВІК

Калі зямлю сціскаюць маразы,
Што аж рыпяць, як па ядвабе, палазы,
Хоць крупка сыпле густа белай маннай:
Сушняк падлеткі цягнуць купай саннай,
І кожны прыхапіў на плечы ношку,
Што суччамі тапырыцца, бы вожык.
А хутка пост — запусты на зыходзе,
Вязанкі скідваюць ля рэчкі і па лёдзе
Са спрытам коўзаюць непадалёк палонкі,
Расчырванелыя, са смехам звонкім;
Штурхаюцца і падаюць на плыткі
Снег, каб пакінуць па сабе адбіткі;
Аж пры канцы, узрушаныя бегам,
Лепяць усёю талакой са снегу
Снегавіка: на месца носа — шышку,
У зубы пхаюць піпку-качарыжку,
Замест вачэй ўтыкаюць па суку,
Даюць мятлу разгатую ў руку;
Каб вечарам, дамоў прыйшоўшы з рэчкі,
Сядзець пад лямпай каля цёплай печкі
І маляваць кавалкам вапняка
Таго, з мятлой і піпкай, дзівака.

1919

ДАРОГА

Пясчаны пас між елак з малахіту,
Як між дзвюх сцен, бяжыць з-пад ног у далеч,
Звужаецца і клінам бледнай сталі
Урэзваецца ў зелень аксаміту.

Па-над гасцінцам вершалінаў хвалі
Збліжаюцца, ўтвараючы з блакіту
Яліну, што ляжыць нічком, нібыта
Яе вятрыска вывернуў у шале.

За лесам шлях выходзіць на раўніну.
Усцяж стаяць слупы, як дамавіны,
З нацягнутым на фоне неба дротам,

А на дратах, нібы на нотным стане,
Чарнеюць ластаўкі, як ветру ноты,
Па якіх ён выконвае літанні.

1919

КУМКАННЕ ЖАБАЎ

Калі бусел на змярканні
Прылятае з палявання
І зара залоціць поле —
Жабам радасць і прыволле.
Пачынае ў цішы кумкаць
Кумцы кумка, кумцы кумка,
Покуль спяць буслы ў буслянцы,
Можна кумкаць, не баяцца.



Пачынае сонна, глуха,
Бы са дна ўздыхаюць духі;
З сажалкі, пакрытай тванню,
Быццам ікаўкі рыданне,
Енкне ціха, сумна, слаба:
«Кепска жабе, беднай жабе!
Да схаванай ў гразкай багне
Ні адну душу не цягне,
Ні адной істоты блізкай
У халоднай, брыдкай, слізкай.
Бо не ружай ружавееш —
Камяком зямлі шарэеш,
Прашчур твой — камень шурпаты,
Смутак у вачах лупатых,
Рот ад вуха і да вуха,
І завешся ты: рапуха!
Хоць хаваешся ў балоце,
Ловіш мошак у чароце,
Цябе ганяць, ненавідзяць.
Вох, за што нас, кумка, крыўдзяць?»



Калі бусел на змярканні
Прылятае з палявання
І зара залоціць поле —
Жабам радасць і прыволле.
Пачынае ў цішы кумкаць
Кумцы кумка, кумцы кумка,
Покуль спяць буслы ў буслянцы,
Можна кумкаць, не баяцца...



«Слушна кажаш, кумка, слушна.
Бо і ў радасці нам скрушна.
Скуль той сполах перад намі?
Нас баяцца ўзяць рукамі,
Трапім жа каму на вочы —
Той убок спяшае збочыць.
Ды хоць гнусіць зрок рапуха,
Але радуецца вуха,
Калі спеў яе пачуе.
Глузду нам свайго бракуе,
Розум божы ў нас затое,
Што стварыў усё жывое.
Чуюць людзі сярод змроку,
Што іх сум ляжыць глыбока,
Невымоўны, неабдымны.
І таму, калі мы гімны
Кумкаем, а небаракі
Не знаходзяць слоў ніякіх —
Кожны ўзносіць свае жальбы
Да нябёсаў мовай жабы».



Калі бусел на змярканні
Прылятае з палявання
І зара залоціць поле —
Жабам радасць і прыволле.
Пачынае ў цішы кумкаць
Кумцы кумка, кумцы кумка,
Покуль спяць буслы ў буслянцы,
Можна кумкаць, не баяцца...



«Кумка, кумка! Слухай, кумка!
Разумею слабай думкай:
Цяжка жабам! Цяжка людзям!
У духмяным ночы цудзе.
Калі ў сне зямлі разлогі
Размаўляюць ціха з Богам,
Калі зоркі неўзаметку
Распускаюцца, бы кветкі,
Калі месяц ясназоры
Рассыпае ў росах зоры,
А туман па-над вадою
Сны сплятае чарадою:
Як не енкнуць з той нагоды,
Што краса і бляск прыроды
Праплываюць, сеюць чары
У душы любой пачвары,
Ды анёлаў з іх не робяць,
А ў галечы, у жалобе,
У лятунках, жалю вартых,
Пакідаюць іх з пагардай».



Калі бусел на змярканні
Прылятае з палявання
І зара залоціць поле —
Жабам радасць і прыволле.
Пачынае ў цішы кумкаць
Кумцы кумка, кумцы кумка,
Покуль спяць буслы ў буслянцы,
Можна кумкаць, не баяцца...



«На якое, кумкі, ліха
Гэтак кумкаць! Не ад пыхі
Пагарджаюць намі, кумкі,
А ад жалю і ад думкі,
Што ў нас душы не ў блакіце,
Што ў нас сэрцы не ў зеніце.
Дух людскі слабы і кволы,
Як ты, жаба, невясёлы,
Тоне ў нэндзы, тоне ў багне,
І ўсё тужыць, і ўсё прагне.
Зрокам ганіць ён брыдоту,
Слыхам любіць ён маркоту.
І калі глядзіць на зоры,
Яго точыць немы сорам,
Што сярод акрасы цуднай
Ён цямнее плямай бруднай:
Вось тады мы і галосім
Тое, што ён нішкам носіць.
Добра быць рапухай брыдкай,
Бо ніхто ў абліччы гідкім
Ганьбы для сябе не бачыць...
І заўжды яе прабачыць».



Калі бусел на змярканні
Прылятае з палявання
І зара залоціць поле —
Жабам радасць і прыволле.
Пачынае ў цішы кумкаць
Кумцы кумка, кумцы кумка,
Покуль спяць буслы ў буслянцы,
Можна кумкаць, не баяцца...

1919

ЦЕНЬ

Сцежкі нашых сустрэч прамінем без аглядкі.
Тут мы слухалі ліп шапаценне.
Ад тых дзён засталіся адны толькі згадкі:
Дык не будзем таптаць дрэў тых цені.

Па-ранейшаму сонца тут льсніцца пагодна,
На зялёным квітнее каберцы:
Толькі голас твой сёння, як цень твой, халодны
Й такі самы, бы цень твой — без сэрца.

Як знайсці мне ў сабе жыццядайную сілу,
Каб душа як скала не знямела:
Калі ты мяне ценем халодным акрыла,
Ты, што сэрца пяшчотнае мела...

1921

ЗАХАД СОНЦА

Калі ачахне пацалункаў жар,
Не будзем дакараць адно аднога:
Хай поўніць нас маўчанне, ад якога
Сумней каханне і глыбей душа.

За намі захаду барвовы пас:
Глядзім на шлях, які мы даастачы
Прайшлі і, дрыжучы ад сцюжы, бачым,
Што цені нашы большыя за нас.

1921

ЗАБЫТЫ

Стаючы ў нерухомай, маўклівай чарзе, што віецца
У смугу далягляда бясконцай дарогай-вужакай,
Я чакаю з працягнутай перад сабою рукою
Добрай дарыльшчыцы.

Прайшла ціхай, бязгучнай ступою і кожнаму якар,
Звіты з кветак, паклала ў далонь... А мяне прамінула!
Глянь жа, ты, каго клічуць жыццём: засталася рука мая
Без падарунка.

1921

ХВАЛАСПЕЎ БАРВАМ

Фрагмент

...О, барвы! Прытулак,
Любы вачам, у журбе патанулым!
На небасхіле заранак літанні!
Пас сяміфарбны вясёлкі, што граннем
Вабіць, нібы сяміхор'е анёлаў!
Росы дажджу, што ільснящца наўкола,
Неба адбіўшы ў сабе стораэова!
О! безмеж неба, абсяг для вандровак
Зменлівых хмараў! Марская прастора —
Сіне-зялёнае млечнае мора,
Дзе ўсіх пачуццяў зіхціць шматталоссе!
Гай пры гасцінцы вясною і ўвосень
Глыбкі, як мудрасць, як свята, прыгожы!
О, аксамітных калёраў раскоша,
Несумяшчальных акордаў багацце,
Што на змярканні кладуцца ў суладдзе!

Водум фіёлак! Экстаз пурпуровы
Ружаў! Лілеі цнатлівая споведзь,
Недасягальная бруду! Уборы
Мятлушак яркіх і птушак, што пёры
Пылам каштоўных каменьчыкаў мыюць!
Хвост у паўліна і ў голуба шыя!
Рыб і вужакаў луска, што ўбірае
Зыркасць акрасы глыбіннага краю,
Дзе прыхаваныя перлы й каралы,
Як пад зямлёю смарагды й апалы!
Ты, кроў, найпершая вартая спеву,
Маці румянцу: кахання і гневу!

Свеце, чым ты без святла і без фарбаў
Быў бы, калі б усе гэтыя скарбы:
Кветкі й лістота, вада і паветра
Зніклі бясследна, як вечар у нетрах
Ночы, што змрокам паліву сцірае
З твару зямлі? Што жыццё захавае
З дзіўных прыгостваў сваіх? Ці салодкі
Быў бы шум дрэў, свіст птушынай чародкі,
Спеў вадаспада і ціпшы маўчанне,
Калі б яны ўсе не ў сонечным ззянні,
Шматкаляровым, гучалі, дзе ў згодзе
Яснасць са шчырасцю ўпоручкі ходзяць?
Ці адчувалі б мы радасць і шчасце,
Хоць яны сны толькі, што зрок нам засцяць?
Ці не па-іншаму шэпча лістота
Ў час веснавы і ў асеннюю слоту?
Ці не здаецца лагодны ўдзень пошум
Жудаснай ноччу глухім і варожым?
Хіба духмяная персіка мякаць
Гэтак жа цешыла б нас сваім смакам
Без залацістасці соку й лушпіны,
Ад пекнаты якой поўніцца слінай
Рот, калі плод мы бярэм сакавіты,
Быццам спакусаю, сонцам абліты?
Хіба пах кветкі, у змроку разліты,
Сэрца не поўніць пакутай і скрухай?
Ці ж не гнятуць хмары ценямі духу?
Хіба кашмараў начных панаванне
Дзень і святло не знішчаюць дазвання?

О, таямнічыя здані ўяўлення!
Еднасць пачуццяў і барваў! Спляценне
Духу й святла — залатая суполка,
Першакрыніца адзінства на золку
Светастварэння! Надзея, што жывіць
Моцаю зелень! Барвянцу прылівы,

Бунт найпрыгожшы, які цвеліць вусны!
Ты, жаўцізна, сплаў хвалы і спакусы!
Ты, ў блакіт, покрыў цішы, нябёсы
Мараў і сноў... О, суладдзе дзівосных
Сілаў, што прагнуць з'яднання! О, знакі
Паразумення ў калісь адзінакім
— Перад біблейскім «хай будзе!» былі вы —
Ладзе жыцця, перайменным ў імклівай
Змене крыві чалавека і зелля!
О, барвы смутку і барвы вяселля!
Вечар журлівы... а на небакраі
Пас зараніцы агніста палае!
Восень, а ўбор залаты на галіне!
О, чысціня глыбіні рэлігійнай
Барвы і святла! О, вачэй таямніца,
На самым дне якой дзівам іскрыцца
Наша душа! Хіба гэтак прыўкрасна
Вочы зіхцяць не таму, што не гаснуць
Іскры здзіўлення ў іх? Хіба на свеце
Ёсць лілавейшыя сенні за квецень
Верасу? А наша думка жывая
Хіба святой, як святло, не бывае?
Хто перад барваў красой запярэчыць,
Быццам яны толькі вонкавасць рэчаў,
Сон іх, і одум, і мройная думка?
Хто ж рэчам душы замкне, калі мука
Гэта таемнасць любога цярпення? —
Барвы! Маўклівая споведзь камення,
Дрэў і вады, заімшэлай пячоры
І пералівістай ракаўкі мора —
Споведзь братоў і сясцёр, што для Бога
І для людзей наўспак смерці жыць могуць.

Але ж самім боскім, мудрым каханнем
Быць ім не суджана! Калі зляканне
Праўду дратуе, калі ўсё навокал

І ўсё ў душы зман затульвае змрокам:
Барва, ад жаху ты шчытная маска!
Ты сярод зманаў як літасць, як ласка!
Ты міласэрнасць, што слепіць нам вочы
Дзівам, калі смерць у дзверы стукоча...

1922

ІДЗЕ ГАСЦІНЦАМ...

Ідзе гасцінцам люд гурбою,
Надзённы хлеб нясе з сабою.

Па мерзлаце, што ногі студзіць,
Убогія плятуцца людзі.

Рыдлёўкі на плячах трымаюць,
Вятры рыззё іх прадзімаюць.

— Што, людцы, гоніць вас па свеце?
Куды й навошта ўдаль ідзеце?

— Ідзём у поце мы і ў зморы,
Каб багаву раллю агораць.

Ідзём капаць папар мы боскі,
Каб пахаваць там лёс наш жорсткі.

Нясём з сабой хвароб бярэмы,
І самі лекары сабе мы.

Мы й лекары і далакопы —
На нас паўсюль вялікі попыт.

Жарствой мы лечымся спрадвеку,
Рыдлёўкі нам заместа лекаў.

— Якая ж вас гняце знямога?
— Бракуе нам, бракуе Бога.

1927

ХВОРЫЯ Ў ПРЫЁМНАЙ

Як прахожыя на тлумных вулках, каторыя
Моду, вопратку й звычкі агульныя маюць,
Як зняможаныя пасажыры ў трамваі,—
У прыёмнай да лекара сядзяць моўчкі хворыя.

У нямыя муры, бы ў іконы, ўглядаюцца,
За спакоем іх — думкі трывожна-няпэўныя,
Незнаёмыя ўчора, сягоння — бы крэўныя,
Абыякім зрабіць выраз твару стараюцца.

Урачыста сядзяць уздоўж сцен, бы ў чаканні
Калі вырак смяротны ім вынесуць суддзі,
І калі б'е жалобна гадзіннік — у спудзе
Аглядаюць, хто першы нябожчыкам стане.

Тут сышліся ў адно ўсе хваробы славутыя:
У адных твар бы з воску, ў другіх —
быццам з вапны,
Хлараформ і эфір удыхаюць і сквапна
Пазіраюць на мэблю — яна не пакутуе.

У запылены бюст Эскулапа з надзеяю
Углядаюцца, і ў ліхаманцы ім мрояцца
Цуды-лекі, якімі ўсе немачы гояцца:
Кроплі рэдкія ці парашкі цудадзейныя.

Паказаннямі градусніка ўстрывожаным —
Сёння ім, хто не меў веры ў Бога ні каліўца,
Цудадзеем магутнейшым лекар ўяўляецца,
Які хутка ад смерці ўцячы дапаможа ім.

Прысягнуць яму кожны хоць зараз гатовы...
Не шкада ні маёнтка, ні скарбаў ніякіх,
Абы стаць выключэннем сярод небаракаў...
У прыёмны пакой уваходзіць чарговы.

Паглядзелі з цікавасцю ўсе на наведніка,
І калі ён на лаву сеў, зноўку са смуткам
Уталопілі позіркі ў дзверы бялюткія,
На якіх, як надзея, зіхціць клямка медная.

І яшчэ адзін хворы, як цень непрытомны,
Уваходзіць з надзеяй у гэты закутак —
І расце, разбухае ў бязмоўі пакута!
Напірае на змрочныя сцены прыёмнай.

Цісне боль і ўпіраецца ў панцыр пакоя,
Быццам цмок, які трупы жарэ і паволі
Раздзімаецца, пухне і хоча на волю
З клеткі вырвацца, свет захлынуўшы сабою.

І здаецца, што лопне пакой... І раптоўна
Лопнуў ён! З гучным галасам, звонам і трэскам!
Быццам выбухнуў порах — і сцены, як трэскі,
Разляцеліся ўшчэнт ад пакут неўтаймоўных.

І ўжо прэ адусюль натоўп хворых, і маса
Іх расце і ўшчыльняецца з кожнай хвілінай,
Бы не вуліца ўжо і не горад — краіны
І свет цэлы ў прыёмную збегліся разам.

Хто даўней папрыходзіў, сарваўся ў трывозе
З немым крыкам, такой не стрываўшы навалы,
На калені упаў — і ўсе шумным кагалам
Папаўзлі з енкам, стогнам па цвёрдай падлозе.

Рукі цягнуць да мэты сваёй у адчаі
І ў адзіныя дзверы, яшчэ ацалелыя,

Пруць у роспачным жаху гурмой звар'яцелаю,
«Адчыні нам, збавіцель!» —
крычаць не змаўкаючы.

Цэлы свет у смяротнай пакуце галосіць:
Ён, Вялікі Бязбожнік, планету ўсю цалкам
Зрабіў сёння прыёмнай, дзе хворыя палка
Аб збавенні, звярамі скуголячы, просяць.

Задрыжалі ад вэрхалу дзікага вежы,
Скалануліся гмахі жалезабетонныя,
З грукатаннем абрынулі ў прорву бяздонную,
У цямноту, да згубы сваёй непазбежнай.

І калі ўпалі з трэскам апошнія пліты,
Па-над друзам руінаў застаўся адзіна
Велізарных памераў пясочны гадзіннік,
Які шэрым пяском засыпаў перабітых.

1927

ВЫСОКІЯ ДРЭВЫ

О, высокія дрэвы, краса над красою,
Вашы постаці ў бронзе згасальных праменняў
Над шматфарбнай, як пер'е паўліна, вадою
Адбіваюцца ў роўнядзі голля скляпеннем.

Пах вады, пазалочанай захадам, плыўна
У нязрушным паветры зыбаецца, мгліцца,
Калі конікі з луга спякотаю жніўнай
Цішыню стрыгуць тысяччу срэбных нажніцаў.

Моўкне ўсё пакрысе і ў глухмень западае,
Змярк ахутвае стрункія кроны імглою,
І прывідамі з іх вольны дух вырастае...
О, высокія дрэвы, краса над красою!

1932

ПА АБЕДЗЕ Ў БЕДНУЮ НЯДЗЕЛЮ

Чым заняцца? Канчаецца тыдзень рабочы
Хоць і веснім нядзеляй, ды мглістай і сіняй,
Голым паркам бязлістым не цешацца вочы,
Дый астатняе цемніцца шэрай гадзінай.

Аміякам прапах гарадок і бензінам,
Вокны крамаў замкнёных глядзяць па-сірочы,
З кіназалы, дзе тлум, калатня, тузаніна,
Тхне такою задухай, што хочацца збочыць.

Зноў на мітынг цягнуцца няма штось імпэту —
Лепш вярнуся дамоў, запалю цыгарэту,
Сяду ў крэсла пад лямпай і буду да золку

Разбіраць свой старэнькі гадзіннік без лупы,
Дбайна чысціць дэталькі і складваць да купы,
На паперыну чыстую, шрубкі і колкі.

1932

ВІД З УЗГОРКА

Тчэ восень згадкі. У блакіце
Плывуць срабрыстыя аблокі,
Нібыта думкі аб нябыце.
Мо прошласць — гэта сон, і толькі?

Гляджу на поле залатое,
Што нікне ў жальбе безгалосай,
І ўсё навокала такое,
Нібы глядзіш на свет праз слёзы.

1932

НАПРАДВЕСНІ

Вясна, што будзіць гойнымі вятрамі
У дрэвах кроў і ў свет нясе лятунак,
Бы ў далакопа, чорнымі рукамі
Раскопвае паўсюль барознаў труны.

З пpаталін у садах, палях, гародах
Б'е ў голаў хмельны дух зляжалай гнілі
З міязмамі ад тхліны, са смуродам
Гніення, з мляўкім водарам магільным.

Ды пахам потнага, жывога цела
Шыбае ўжо з-пад спрахлага абруса...
Такі вось пах святы, напэўна, мела
Магіла уваскрэслага Ісуса.

1932

КУТОК

Вады зялёнай шкло,
Травы зялёны цуд,
Блакітнае святло.

Спрат ціхі ад пакут,
Дзе нікне згадак зло
І моўкне ветру гуд.

Свет гасне за імглой...
Існуе толькі тут
Вады зялёнай шкло,

Травы зялёны цуд.

1932

POGGIBONSI

Навошта ў спёку крочыць без аглядкі
Па сцежцы, што сама цяпер ляніва
Ляжыць у непрытомнасці шчаслівай,
Заблытаўшы канцы ўсе і пачаткі?

Куды ісці, калі пшаніца справа
Зялёна-срэбным коласам нас цешыць,
А злева вінаграднік, буйны, свежы,
Нам сэрца поіць, быццам муст ласкавы?

На сонцы сядзем, як перад парогам
Бацькоўскім, тут, дзе цягнуцца да неба
Віно і збожжа, кроў і цела глебы,
Дзве таямніцы, што нас лучаць з Богам.

1932

ВЕЧАРОВАЕ СВЯТЛО

Ралля згасальным медзяным праменням
Сваіх барознаў раскрывае жылы
І смокча хмараў вогненныя вымі,
Напоўненыя жыццядайнай сілай.

Пад вечаровы звон касцёла кленчыць
Апошні бляск натхнення залатога
Між скібаў, як нябачная прысутнасць
Архангела, што праслаўляе Бога.

1932

BONACCIA

Уладзіславу Каціцкаму

Вялізнае, нявэтлівае мора,
Разлітае без краю і мяжы,
Няўзрушна спіць ў спякотлівай прасторы,
У нечуллівай глухаце ляжыць.

Над стомай шыбы сіне-залацістай
Сіксцінскай хмары пляма, быццам пух,
Пульхнатая, плыве ў блакіце чыстым,
Бы ўзняўся над вадою Божы Дух.

А я, сагрэты ззяннем той гадзіны
Цераз заслону змружаных павек,
Ляжу, нібыта залаты груд гліны,
З якога будзе злеплен чалавек.

1932

ПАХВАЛА

Галава, званіца крышталёвых думак
У забрале валасоў
З яснага золата або чорнае сталі!
Шырокія нябёсы скляпеністага чала,
На якім вісіць арол брывоў!
Вочы, горныя паўлінавыя азёры,
У якіх купаецца голае бостава сноў!
Нос, двухкрылае стырно нюху,
Сляпы, а чуйны да сфінксавага дыхання!
Вушы, завілыя лабірынты,
Дзе ніколі не заблудзіць німфа Рэха!
Вусны, двухлістая ружа,
Складзеная з трыццаці дзвюх жамчужынаў,
Якая вее водарам кахання,
Мёдам мудрасці
І перунамі навальніцы!
Барада, прыступка першая й апошняя
Да пурпуровай прычасці пацалунка!
Горла, крыніца смеху й спеву
У стромай цясніне смяротнага хрыпення!
Шыя, гнуткае, зграбнае сцябло,
На якім спачывае думная кветка галавы!
Плечы, што ўраўнаважваюць
На шалях рук
Радасць і смутак,
Лісце пальмы й мячы!
Грудзі, спарышы,
У якіх бруіцца
Вечнажывая вада дыхання!
Чэрава, безабаронны шчыт
Магутнага начыння й правадоў жыцця!

Клубы, стрункая ліра,
На якой грае песню кахання
Маладосць і пажада!
Сцёгны, касцельныя слупы,
Што нясуць рухомую святыню цела!
Калені, гнутыя спружыны скоку й бегу,
Малітоўны зэдлік гонару ў абліччы вялікасці!
Ступні, пяцівясловыя лодкі на плыні
І падмурак трывання, моцны, як прысяга!
Хвала табе, цела,
Каштоўнае начынне духу,
Неацэнная амфара,
Якая праз усе часы й стагоддзі
У зменлівай і неперарыўнай чарзе
Носіць з гонарам і пакораю
Пралітую на крыжы кроў
І віно кахання,
Душу Гектара, Платона
І Пранцыска з Асыжа!

1932

СОНЕЧНЫ ГАДЗІННІК

На паркавым газоне ў дождж і спёку
Гадзіннік сонечны стаіць навідавоку
І пахваляецца, што ён адзіны
Адлічвае шчаслівыя гадзіны.
Ты не хваліся, бо заслугу засціць
Хвальба і не адзін ты лічыш шчасце.
Навошта гэта скупасць у рахубе
Шчаслівых хвіляў, нашым сэрцам любых?
Апроч таго, хоць нас ты ўжо не цешыш,
Недагаворанасцю прыхаванай грэшыш:
Не лічыш ты і тых хвілін гарачых,
Што ў цень плывуць, дзе сонца нас не бачыць.

1932

НЕПРАЎДАПАДОБНАЕ МОРА

Колер гладзі марской ні на што не падобны,
Да смяхотнага пекны і неверагодны:
Скрозь фіялкава-цёмны, як быццам жалобны,
І, аднак жа, ад радасці дзікай зіхотны.

Тут знікае мяжа паміж явай і казкай,
А былі б людзі тут, не паверылі б, пэўна:
Хвалі цягнуць далоні, гатовыя пляскаць...
Невідушчы Гамер рушыць з лютняю спеўнай.

1932

МІТЫНГ

Густы натоўп, галовы і галовы,
Нібы галодны цмок тысячавухі.
Пляц, як заліты клеем папяровым,
Дзе пры адной адна прыліплі мухі.

Прамоўца на трыбуне штось тлумачыць,
І, кулаком махаючы, шпурляе
У іх маланкі слоў, і наастачу
«Гура!» хрыпіць, нібы рыззё здзірае.

Як па загаду чарадзея ўгору
Ляцяць грыбы капелюшоў, і глянцам
Блішчыць аголеных патыліц мора,
Нібы ікра ў расчыненай бляшанцы.

1932

АШЧАДНЫ

Ён у будзень працуе на сонцы і ветры
З нівелірам, рулеткаю, рэйкай і шпуляй,
А ў нядзелю крухмальную носіць кашулю,
Кацялок, і насоўку на сэрцы, і гетры.

Ды, ашчадны, кіно паглядзець ён не можа,
Абміне ў луна-парку за мілю арэлі,
На ільве не пракоціцца на каруселі,
Для яго ўсе такія забаўкі — раскоша.

Ён не з тых, хто шукае для сэрца каханку,
І разгульнай кампаніі ён унікае;
Вось хіба што ў ларку рызыкне выпіць шклянку
Мінералкі, што смак нагі потнае мае.

1932



Дахі! Вы сузіраеце вулкі ў пагардзе
І натоўп віражлівы, нахабна-прадажны,
Я гляджу на вас цераз акно на мансардзе
І, як вы, адчуваю сябе недасяжным.

І няхай не дайсці мне да вечнага Рыма —
Цэгла комінаў вашых, затканая хісткім
І размытым, на паціне захаду, дымам,
Майму сэрцу здаецца Палацінам рымскім.

1932

ВОСЕНЬСКІ ЗАХАД

Наступнае, бы сад зачараваны,
Мінулае, бы цяжкі кош з пладамі.
Дыван з лісця апалага сатканы,
Гронкі агню, павіслыя махрамі.

Змерк замест дум прадзе матыў шматфарбны,
Нібы маленства, рассявае цуды.
Няма ні згадак, ні ілюзій марных.
І праўда ўсё. Усё ва ўсім паўсюдна.

Сок пурпуровы гронку распірае,
Віном адборным льецца ў дні кахання.
Было ўсё пекна сёння. Хай сплываюць
Руда-чырвоныя лясы змяркання.

1936

У ДАРОЗЕ

Незадаволенасць, як пульс планеты,
Змен ува мне шукае штохвіліны.
З дарожным кіем ідучы гасцінцам,
Я б'ю былыя дні, бы посуд з гліны.

Я абмінаю звабныя крыніцы
І полым вечнай смагі раздзімаю.
Я чую, што павінен кімсьці стацца:
Так Богу хочацца. А кім? Не знаю.

Я сябра ўсім, хто ў міражы не верыць,
Якімі сонца нас удзень суроча.
Дзень хутка праміне. Сава Мінервы
Свой лёт распачынае толькі ўночы.

1936

СПРЭЧНАСЦЬ

Дзікай выспы краса, трыумфальнае мора,
Львы пустэльні, дубровы ля млечнай дарогі,
Шапкі лёду, вулканы, паўночныя зоры
І героі, святыя, паэты, паўбогі.

А пры цудах тых, бачных і духу, і воку,
Свет звыродлівы, поўны брыды і агіды,
Здохлы кот, што згнівае ў смярдзючым рыштоку,
І галеча, што б'е ў катуху сваім гніды.

Я прымаю жах існага з подзівам звыклым —
Ні муры, ні нягоды яго не астудзяць,
Слаўлю зоркі й суглінак, да ступняў прыліплы,
Бо штодзённасць, як боскасць, той самы страх
будзіць.

1936

ВЯРТАННЕ

Ты, хто зваўся маім іменем,
Падобны да мяне, як адбітак у вадзе,
Не наведваў мяне
Праз доўгія гады.

Сёння на змярканні стукаешся ў мае дзверы,
Поўны роспачы ад паражэння розуму і веры,
Каб прасіць у мяне дапамогі [redacted] рады.
Што табе адкажу?

Не патонеш у хвалях,
Па якой ступалі ступні,
Намазаныя вонным алеем.

І не заблудзіш у дарозе,
Па якой цябе вядзе
Прабітая цвіком рука.

1936

ФАНТАН

Фантан — лілея водная,
Прыгожая, але бясплодная.
І квецень, з выгляду жывая,
Ніякіх водараў не мае.

Фантан шкляным крылом трапеча,
Прыкованым навечна.
За ветрам хіліцца з падножжа,
Ды матылька дагнаць не можа.

Крыло, лілея і фантан:
Падман ці не падман.
Вясёлкавая пырска —
Для тройцы ўсёй калыска.

1936

НАД СТАЎКОМ

Ціхмень на гладзі рэчкі спячай
Блакіціцца люстэркам гладкім.
Ставок ад бляску стаў нябачны:
Аслеп даўно. І анігадкі.

І раптам лопаецца шыба
Вады ва ўсплёску бліскавічным.
З глыбіняў сіганула рыба:
Уласнага маўчання клічнік.

1936

НА ЗОЛКУ

Напоўнены бляшаным плачам
Дажджу, што ў дах дудніў бясконца,
Аслеп я, бы пугач няйначай,
І ў сне баюся дня — без сонца.

Пракіслая іржою слота
Пад сцёкам балбатлівай рыны
Сваім апрыкрым анекдотам
Зямлю катуе без супыну.

Тут, дзе дранцвее бляск і колер,
Дрыжыць світанак печкай зімнай,
І ў сэрца ляк трывожна коле,
Што ў неруш сну гадзіннік грымне.

О, горкі час, о, час нязрадны,
Час абуджэння слотным раннем,
Калі бушуе прымус здрадна,
Бы ўлетку рэчка ў Закапанэ.

1936

OTIUM

У нядзелю апоўдні ўсе фартэпіяны
Граюць так, што пакойчык мой робіцца бубнам.
Адусюль паасобку грымяць і сукупна.
Стол з падлогаю скача. Мур хістаецца п'яны.

Ад «Малітвы дзяўчыны» да «Рапсодыі» Ліста
Спазмы фіярытурак натужна скавычуць.
Лямпу-бомбу хапаю рукой тэрарыста,
Але шнур яе гасіць парыў ваяўнічы.

Раптам джаз какафоніяй пекла шыбае,
І ўжо сам я, бы д'ябал, танцую з мурынам,
І цыганка, калі я прытомнасць губляю,
Ашалела калоціць мне ў лоб тамбурынам.

1936

ШУКАЛЬНІК

Адвячоркам, калі з бляскам першых ліхтарняў
Шпагі промняў скрыжоўвае нізкае сонца,
Паўз сталы, што стаяць каля мура кавярні,
Бледны сунецца цень з ліхтаром на аборцы.

У скамячаны брыль і ашмоцце адзеты,
Ён далёкім здаецца вачам нават зблізу,
Недарэчным на фоне зары сілуэтам,
З чалавека няўдалым, пляскатым эскізам.

Ды не здань і не дух ён, хоць прывідны звонку.
На нагу прыпадаючы, з гэткім імпэтам
Часам ён папраўляе штаны на пастронку,
Бы рыдаў ці рукамі размахваў над светам.

Кій з цвіком на канцы у руцэ ён трымае,
Пад сталы ім уважліва меціць, з-пад вока,
І раз-пораз зямлю вастрыём працінае,
Як святы Юры дзідай пякельнага цмока.

Ён пільнуе, выглядвае штосьці з увагай.
Што ж шукае мраяр гэты або істэрык,
Дыяген ці Калумб у абліччы тулягі?
Неадкрытых Сезамаў? Нязнаных Амерык?

Гэты ў зрэб'е спавіты жабрак ці філосаф,
Абыходзячы вулкі мястэчка старанна,
Сваім кіем збірае бычкі папяросаў,
Быццам рэшткі пагаслых, пігмейскіх вулканаў.

Але верыць: аслепіць калі-небудзь бляскам
І яго... Нездарма, быццам у ліхаманцы,

У вачах зіхацяць фанатычныя яскі,
І не можа дрыготку суняць ён у пальцах.

Срэбнік блісне? Дукат? Скарб! Шчаслівая доля!
Ды, на жаль, хто ж не знае пра чорную здраду?
Гэта ад дарагіх цыгарэт бандэроля
Або танны ашмётак фальгі з шакаладу.

1936



Хто той дзівачны незнаёмы,
Хто прымхамі мяне суроча,
Раскідвае, бы сноп саломы,
І зноў у сноп збірае клочча.

Душу маю, як шашаль, точыць,
І цела паліць ліхаманкай,
І не дае спачыну ноччу,
Аднак бадзёрасць дорыць ранкам.

І ўзрадаваць усмешкай можа
На змярку, калі я ў адчаі,
І дзеліць шлях, як раздарожжа,
І берагі, як мост, злучае.

1946

ЗМЯРКАННЕ

Людзі з поля ідуць, брэх напоўніў мястэчка,
Між халупаў, як злодзеі, шастаюць цені,
Быццам шабля сталёвая, свеціцца рэчка,
І на сэрца з сутоннем кладзецца сумненне.

Тупацяць пасля працы валы цяжкім крокам,
Пруць авечкі гурмой, як лавіна трывогі,
Толькі дуб, напалову адсечаны змрокам,
Кронай вогненнай моцна шчэ верыць у Бога.

1946

Б. Л.

Узняць цяжкія рукі для малітвы
Нядоўга, бо гаротны бляск змяркання
Не пакідае нам надзей назаўтра.
Ляжыць на раздарожжы збан разбіты,
З якога сочыцца каштоўны трунак,
Аднак нідзе ніводных прагных вуснаў.
Сціхае спеў нямы. Віюцца ў змроку
Павеўных валасоў даўгія пасмы.

1946

У СТАРЫМ САДЗЕ

Сад, мурава і дрэвы,
Тут, як за райскай брамай,
Жыло маё юнацтва
І шчасце гэтаксама.

Я ўслухваюся ў шолах
Дрэў, смуткам ахінутых.
З тых дзён няма нічога,
І толькі я стаю тут.

Жыццё маё завяла
І адышло ў край ценю.
Шмат што адкрасавала,
Ды тое свет не зменіць.

Душа глядзіць навокал
Асалавелым вокам,
Бы месяц, які ў небе
Забыла ноч няўрокам.

1946

НІКА З САМАФРАКІІ

У павеўным убранні тваім чую зыкі
Лёту шпаркага — не перагоніць ніякі
Птах цябе, о багіня магутная Ніка,
У спрадвечным парыве тваім з Самафракіі!

Несучы лісце лаўра і славы, палошча
Паднябесны блакіт тваe дужыя крылы.
Слава не для мяне. Тым я толькі зайздрошчу,
Для каго галаву ты ў падзенні скрышыла.

1946

ДВАІСТАСЦЬ

Не пух лебядзіны, мімоза,
Крыло матылька, бляск лазуры,
А сполах, трывога, пагроза,
Штохвілі пярун — пуга буры:

На небе біблейскія хмары,
Зямлю спустошае халера,
І сполах мне ў голаў ударыў,
Як бог невідочны Гамера.

О свеце, разбіты хваробай,
Разбоем, хлуснёю, абразай,
Ты дзіўна ў сабе увасобіў
Шаленства і боскасць адразу.

То попел мы сыплем на голаў,
То ў небе купаемся сінім!
Я бачыў на рынку анёлаў
І ў тлуме адзін, бы ў пустыні.

1946

НАД СВЕТАМ...

Над светам змрок павіс і болем сэрца нудзіць.
Ах, праца больш не вабіць чалавека,
Жыццё больш не жыццё, і людзі ўжо не людзі,
І толькі гноем гной застаўся, а здзек — здзекам.

Над прорвай прорва паўстае і ў прорве гіне.
Няма ні хлеба, ні кахання, ні надзеі.
Ніхто жытла сабе не знойдзе між руінаў.
На падліне і на граху рабак сыцее.

Не знішчаць пошасці ні меч, ні дождж агністы,
Ды хоць усё ў смяротным курчы захлынецца:
Пакутны чалавек ўва мне святым і чыстым,
Дзеля збавення свету, застанецца.

1946

ПРЫ ДУМЦЫ...

Пры думцы аб злачынствах дзікай зграі,
Аб здзеках і разгуле хеўры лютай
Мярцвее сэрца, боль глухі знікае,
На дне душы адно шарэе: смутак.

О, смутак, хоць падбітым куляй птахам
Ляжыш ты нерухома, шэры, ціхі,
Ты вееш Дантавага кола жахам,
Ты мог бы жудаснай зрабіцца кнігай.

1946

НАД ЗМРОЧНЫМ СВЕТАМ НОЧ І ЦІША

Над змрочным светам ноч і ціша,
Хоць блізка, ды чужая сэрцу!
У змроку немы страх блукае
І прымхі, бы вястункі смерці.

Багі, шайтаны і кентаўры
Спраўляюць шабас катавання.
У сцішны цуд светабудовы
Гляджу з адчаем і зляканнем.

Пад неабсяжнасцю нябёсаў
Зямля — у розруху сірочым.
Той не блюзнерыць з нас, хто бачыў
Нябеснае святло аднойчы.

О, міласэрнасць! Бліскавіца!
Прамень, што рэжа змрок зацьмення!
Датуль цябе я буду клікаць,
Пакуль не выб'еш слёз з камення.

Нават калі ў сутонні вечным
Павінен я без сну і хлеба
Чакаць, звярнуўшы твар да зоркі,
Што не ўсплыве ніколі ў небе.

1946

ПЕРШЫ ШПАЦЫР

Жонцы

Мы будзем зноўку жыць у нашым доме,
Мы будзем зноў хадзіць па нашых сходах.
Ніхто пра тое не сказаў нікому,
І толькі вецер шэпча па гародах.

Ты не глядзі на страшныя руіны.
Не плач. Не трэба боль у сэрцы песціць.
Жывём мы, хоць няраз маглі загінуць.
Дык выйдзем жа з развалін на прадмесце.

Мінем трамваяў ціхія прыстанкі...
Жанчына, прыхінуўшыся ад стомы
Да брамы, прапануе абаранкі...
Мы будзем зноўку жыць у нашым доме.

Вітрыны голыя. Замок на краме.
Жыццё хіба што знікла ў антыподах.
Сляпы жабрак гандлюе грабянцамі...
Мы будзем зноў хадзіць па нашых сходах.

Дрыжыш ад сцюжы. Дык захутай шалік.
Без рук, без ног, у шынялях падзёртых
Сядзяць калекі-хлопцы ля шпіталя.
Вунь зелянее рунь за местам мёртвым.

Хлапчук на тратуары ля штыкетаў,
Нагнуўшыся, ў каменьчыкі гуляе,
Пыл выбівае з лахманоў кабета,
І певень на падворышчы спявае.

Пад мурам дрэмле кот. На ўскрайку вулкі
Прахожыя вядуць пра штось гаворку...
Зноў з'явяцца у хлебнай крамцы булкі,
Забразгацяць даёнкі на падворках.

Мінуць, як сон жахлівы, дні разгрому,
Забудзем мы пра раны і пра шкоды...
Мы будзем зноўку жыць у нашым доме,
Мы будзем зноў хадзіць па нашых сходах.

1946

ЗВЯЗДАР

Звяздар замкнуў на ключ вежу:
Паабцінаў каметам хвасты,
Выкінуў у акно клепсідру й чэрап
І пайшоў на маскарад.

Там спаткаў чорнага вершніка,
Які прапанаваў: «Браце,
Мой конь здох, і ў карчме
Я прадаў яго цыганам.
Заплаці свае пазыкі залатою аброццю».

Потым звяздар скакаў з дагарэсай
І гуляў у косці з мажным кардыналам,
Закалоў чатырох Борджыа
І выпіў мора малмазіі.

Ранак заспеў яго пры курадымных свечках.
Каб праветрыць цяжкую галаву,
Ён накінуў на плечы пыльнік
І прамармытаў: «Пашпацырую з хвілю
Па Сярэднявеччы».

Ды там ніхто не зважаў на яго,
Усе былі пры справе:
Бартольд вынаходжваў порах,
Калумб шукаў на мапе Амерыку...

Звяздар павярнуў назад.
Праходзячы ў садзе каля сажалкі,
Ён хацеў убачыць у купальні Сузану,
Ды ўбачыў толькі белага кухара

І дзеўку, якая ля куратніка
Абскубвала на абед гуся.

Ідучы ў задуме на ранішнюю імшу,
Ён завярнуў да лаўкі антыквара
І да вечара праседзеў там.

Шукай палітру святога Лукаша,
Гладзь эльзевіры й альдыны,
Захутвай у чорны ядваб скрынкі.

Венецыя, гледзячы на лагуны,
Сплывае з караблямі ў далечыню.

1954

КРУГІ

Прымружыўшы вочы, ён бачыў:

Сядзелі ўздоўж далягляду,
Густа, як восенню ластаўкі на дроце,
І ўсё бліжэй, штораз меншымі
Канцэнтрычнымі кругамі,
Амфітэатрам —
Нахіляліся наперад,
Уражаныя, здзіўленыя,
Ґлядзелі праз смарагдавае шкло
На яго, які быў усярэдзіне.
І напятымі, бы масянжовыя струны,
Поўнымі захаплення паглядамі
Узнімалі яго ўгору,
Высока-высока,
Аж пакуль ён не павіс пад небам,
Як Сымон Слупнік
Без слупа.

Аднак усё было зусім інакш:

Сядзелі ўздоўж далягляду,
Рэдка, бы кроплі на дроце ў слотны дзень,
І ўсё бліжэй, штораз меншымі
Канцэнтрычнымі кругамі,
Амфітэатрам —
З павернутымі да сярэдзіны спінамі,
З тварамі, звернутымі да небакраю.
І праз смарагдавае шкло
Разглядалі сцёртыя ад ужытку дукаты,
Чыталі біржавыя цэны
Або любоўныя пасланні.

І ненапятыя,
Танюткія павуціны
Замест струнаў паглядаў
Так расслабаніліся і здалі,
Што ён з вышыні
Праваліўся пад зямлю.
Як у вадзе тануў у ёй,
Пакідаючы на роўнядзі кругі,
І апускаўся на дно й глыбей,
У жарало да Плутона,
Дзе й захрас на самай апошняй мяжы,
Вытнуўшыся галавою ў атвор,
Які вёў на другі бок свету,
У чорную ноч нябыту.

А ўгары, уздоўж далягляду,
Анёлы й д'яблы,
Трымаючыся за рукі
І высока выкідваючы ногі,
Скакалі ў вар'яцкім карагодзе,
Лопаючыся ад рогату.

1954

РАСКА

У старым акінутым парку
Я стаяў над стаўком,
Пакрытым таўсматым кажухом раскі.
Згадаўшы,
Якой празрыстай была тут калісьці вада,
Я вырашыў ачысціць яе,
Падняў з зямлі дручок
І пачаў зграбаць зялёную тхлань,
Зганяючы яе ў сцёк.

За гэтым заняткам
Мяне заспеў мудрэц
З чалом, захмураным думкаю,
І сказаў з лагоднай усмешкай:
«І не шкада табе часу;
Кожная хвіля — кропля вечнасці.
На свеце ёсць мноства больш важных справаў».

І я адышоў, прысаромлены,
І цэлы дзень думаў
Пра жыццё й смерць,
Пра Сакрата
І неўміручасць душы,
Пра піраміду й егіпецкую пшаніцу,
Пра рымскі форум і месяц,
Пра мамантаў і Эйфелеву вежу...
Ды так ні да чога й не дадумаўся.
Калі назаўтра
Я вярнуўся на тое самае месца,
Дык убачыў над стаўком,
Пакрытым таўсматым, зялёным кажухом,

Мудраца з праясненым чалом,
Які спакойна,
Кінутым мною дручком,
Зграбаў з паверхні вады раску
І зганяў яе да сцеку.

Наўкол ціха шамрэлі дрэвы,
У галлі спявалі птушкі.

1954

ДЫМЫ

Юльяну Тувіму

Над тлумам горада ў сутонні
Дымы ўзнімаюцца заслонай,
Ў крывавай пене сонца тоне,
Злое, бы сэрца фараона.

Зрабіўшы піраміды працы,
Смыляць далоні ад спачыну,
І без патрэбы угінацца
Выпроствае гарбаты спіну.

З календара лісток стамлёны
Злящеў. Спакоем хата цешыць.
Насустрач з весніцаў зялёных
У радасці сабака брэша.

1954

НАЗАЎТРА

Ад'ехаў прэч картэж юнацтва
З вясновым тлумам і суцехай.
Забраў з сабою смех і песні,
А мне пакінуў толькі рэха.

Настала ўласна тая хвіля,
Калі світанак, чысты, боскі,
Над мітуснёю распускае
З бутона цемрадзі пялёсткі.

І поўніць радасцю, хоць знаю,
Што знікне праз міг без знаку,
І так спакойна мне, нібыта
Я гладжу галаву сабаку.

1954

КРЫЎДА

Мой мудры сабака
Пражыў сваё кароткае жыццё,
Не ведаючы нават,
Што свет — загадка.

1958

ЗДАРЭННЕ

Я раззлаваўся не на жарты,
Парваў лісток і ў печку кінуў,
Бо не даваўся верш упарты —
І ў чорным дыме ён загінуў.

Калі ж мяне скавала проза,
З чарніліцы, бы з чорнай вазы,
Паўстала раптам туберoза.
Так і ў жыцці бывае часам.

1958



Правёўшы ўсіх сяброў, застаўся
Адзін з майго я пакалення,
Я бачыў, і як свет змяняўся,
І сам, як свет, спазнаў змяненне.

Любіў людзей, любіў прыроду,
Глядзеў у прышласць ясным вокам,
Як святасць, шанаваў свабоду,
Спакрэвіч ветру і аблокаў.

Мяне не вабіў помнік слыны,
Грай зычных труб і гучных «брава».

Пусты пакой я вам пакіну
І ціхую скупую славу.

1958

ПАЖЫЦЦЁВЫЯ ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ Л. СТАФА

«Сны пра магутнасць»	1901
«Дзень душы»	1903
«Птушкам нябесным»	1905
«Квітнеючая галіна»	1908
«Усмешкі хвіляў»	1910
«У цені мяча»	1911
«Лебедзь і ліра»	1914
«Вясёлка слёз і крыві»	1918
«Палёвыя сцежкі»	1919
«Савіным пяром»	1921
«Жыць у палёце»	1922
«Іголчына вушка»	1927
«Высокія дрэвы»	1932
«Барва мёду»	1936
«Мёртвае надвор'е»	1946
«Лазіна»	1954
«Дзевяць музаў»	1958

ЗМЕСТ

У. Калеснік. Зямное і занябеснае 3
Снег 13
Сон на крылах змяркання 15
Слота 18
Дзівацкі сабор 20
Цар 21
Восеньскі дождж 22
Таямніца 24
Прыйсце 26
Енк выклятых завулкаў 27
Рана 29
Пра добрую ноч 30
Самотная віла 31
Цнатлівыя бярозы 32
Праз парк юнацтва... 33
Просьба аб крылах 34
Змрок 35
Хрысця з-пад плота 36
Вясновай ноччу... 42
Ад тлуму места... 44
Восеньскі туман 45
Смерць вандроўніка 46
Пагодным днём... 49
Хвіля 50
О, струны ўспамінаў... 51
Кахаць і губляць... 52
Ноч 53
Мне нішто не замуціць... 54
Дождж крыві і агню 55
Мы ўсёй душою там... 57
Пчолы 58
Бульбяное поле 59
Снегавік 60
Дарога 61
Кумканне жабаў 62
Цень 67
Захад сонца 68
Забыты 69
Хваласпеў барвам 70

Ідзе гасцінцам... 74
Хворыя ў прыёмнай 75
Высокія дрэвы 78
Па абедзе ў бедную нядзелю 79
Від з узгорка 80
Напрадвесні 81
Куток 82
Poggibonsi 83
Вечаровае святло 84
Bonassia 85
Пахвала 86
Сонечны гадзіннік 88
Непраўдападобнае мора 89
Мітынг 90
Ашчадны 91
***Дахі! Вы сузіраеце вулкі ў пагардзе... 92
Восеньскі захад 93
У дарозе 94
Спрэчнасць 95
Вяртанне 96
Фантан 97
Над стаўком 98
На золку 99
Otium 100
Шукальнік 101
***Хто той дзівачны незнаёмы... 103
Змярканне 104
Б. Л. 105
У старым садзе 106
Ніка з Самафракіі 107
Дваістасць 108
Над светам... 109
Пры думцы... 110
Над змрочным светам ноч і ціша 111
Першы шпацыр 112
Звяздар 114
Кругі 116
Раска 118
Дымы 120
Назаўтра 121
Крыўда 122
Здарэнне 123
***Правёўшы ўсіх сяброў... 124
Пажыццёвыя зборнікі вершаў Л. Стафа 125

Стаф Л.

С78 Высокія дрэвы: Вершы/Пер. з польск. А. Мінкіна; Прадм. У. Калесніка.— Мн.: Маст. літ., 1994.—127 с.— (Паэзія народаў свету).

ISBN 5-340-01371-5 (беларус.).

Леапольд Стаф (1878—1957) — класік польскай літаратуры. Яго паэзіі ўласціва арыентацыя на класічныя традыцыі, апяванне вечных этычных і эстэтычных каштоўнасцей, духоўнай гармоніі, культу цудоўнага ў жыцці і мастацтве.

С $\frac{8840000000—071}{М\ 302(03)—94}$ 126—94 ББК 84(4П)

Паэзія народаў свету

Літаратурна-мастацкае выданне

СТАФ ЛЕАПОЛЬД

Высокія дрэвы

Вершы

Рэдактар В. С. Сёмуха. Мастак А. І. Карповіч. Мастацкі рэдактар А. І. Цароў. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Л. А. Дзядзюля.

Здадзена ў набор 24.08.93. Падп. да друку 05.04.94. Фармат $70 \times 90^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афс. друк. Ум. друк. арк. 4,68. Ум. фарб.-адб. 4,98. Ул.-выд. арк. 3,57. Тыраж 1500 экз. Зак. 484.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.